ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

№ 289 (3397) Серада 18 сьнежня 1929 г.

Адрэс рэд.: [illegible] 83
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ (III)
Тэлефоны: [illegible]—1074, [illegible]—813, [illegible]—731

РАДЫО У ГАДЗ. НОЧЫ:

АНГОРА, 17. Анатолійскае тэлеграфнае агенцтва падае: «Перагаворы, якія пачаты ў Ангоры паміж нам, народнага камісара па замежных справах СССР Караханам і ўрадам Турэцкае рэспублікі, закончыліся пасьпяхова. У выніку перагавораў пастаноўлена прадоўжыць і замацаваць турэцка-савецкі дагавор аб прыязьні і нэйтралітэце, падпісаны ў 1925 годзе ў Парыжы.

17 сьнежня турэцка-савецкі пратакол падпісан у міністэрстве замежных спраў.

БАБРУЙСК. (НАШ КАР.). СКОНЧЫЛА ПРАЦУ КАНФЭРЭНЦЫЯ БЕДНАТЫ. КАНФЭРЭНЦЫЯ ПАСТАНАВІЛА: ПРАСЦЬ УРАД СССР ВЫПУСЬЦІЦЬ ПАЗЫКУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ; У 1930 г. КАЛЕКТЫВІЗАВАЦЬ БАБРУЙСКУЮ АКР. НА 50%.

За выразную клясавую лінію

(Да нарады яўработнікаў пры ЦК КП(б)Б)

Грандыёзныя дасягненьні, якія мы маем у галіне ўзмацненьня кіраўнічай ролі рабочае клясы на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляюць ца вынікам выразнае клясавае лініі нашай партыі, якая мабілізавала ўсіх працоўных на барацьбу з клясавымі ворагамі, на барацьбу за выкарчоўваньне карэньняў капіталізму і арганізавала масы для рэалізацыі асноўных задач у галіне сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэтыя дасягненьні зьяўляюцца таксама вынікам правільнага вырашэньня намі нацыянальнага пытаньня. Тыя дасягненьні, якія мы маем у галіне вырашэньня нацыянальнага пытаньня, у зьнішчэньні прававое і фактычнае няроўнасьці, паляпшэньня эканамічнага становішча, узьняцьця культурнага ўзроўню і ўзмацненьня пазыцый пралетарскіх мас усіх нацыянальнасьцяй на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, таксама трэба тлумачыць тэй выразнай клясавай лініяй, якую наша партыя праводзіла пры вырашэньні ўсіх пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва.

За апошнія гады мы маем таксама вялікія дасягненьні, як у галіне ўзмацненьня кіраўнічых пазыцый яўрэйскіх рабочых мас, як часткі ўсяе рабочае клясы, павышэньня ўзроўню яе матар'яльнага і культурнага абслугоўваньня, так і ў галіне прыцягненьня да прадукцыйнае працы і ўцягненьня ў аграмаджаны сэктар яўрэйскае беднаты. Далейшыя посьпехі мы таксама маем у галіне ўцягненьня яўрэйскіх працоўных у калгасы.

Усе крыкі аб агульным эканамічным крызісе, які перажываюць яўрэйскія масы, зьяўляюцца паклёпам. Гэтых посьпехаў мы дасягнулі ў выніку ўзмоцненага наступленьня на ўсе капіталістычныя элемэнты і ў тым ліку—яўрэйскай буржуазіі. Гэтых дасягненьняў было-б больш, калі-б у нас ня было прарываў клясавай лініі апартуністычнага характару пры вырашэньні раду пытаньняў, якія закранаюць яўрэйскія працоўныя масы, з боку нашых арганізацый на чале з былым кіраўніцтвам яўбюро пры ЦК КП(б)Б. Курс на зем-ляўпарадкаваньне ўсіх яўрэяў, курс на «здаровага» прыватніка ў капэрацыі, курс на прыцягненьне ўсёй інтэлігенцыі не маглі ня прывесьці да звужэньня колькасьці і пагоршаньня якасьці абслугоўваньня беднаты.

Работа на абслугоўваньні яўрэйскіх працоўных мас адбываецца ў абстаноўцы жорсткай клясавай барацьбы, у абстаноўцы ўзмоцненага супраціўленьня і яўрэйскай буржуазіі сацыялістычнаму будаўніцтву. Таму асноўнай задачай яўработы зьяўляецца садзейнічаньне мабілізацыі і арганізацыі яўрэйскіх рабочых і ўсіх працоўных для барацьбы з капіталістычнымі элемэнтамі і ў тым ліку са сваёй буржуазіяй. Трэба выкрыць да канца ўсе настроі аб тым, што ў нас ужо няма яўрэйскай буржуазіі, што яна ўся ўжо дэклясавана. Арганізацыя яўрэйскіх рабочых і працоўных супроць буржуазіі немагчыма без самай рашучай барацьбы з усімі праяўленьнямі клясавага супраціўніцтва, якое прапагандавалася і фактычна праводзілася ў асобных зьвеньнях раду нашых арганізацый. Трэба рашуча змагацца супроць ідэі і практыкі адзінага нацыянальнага фронту.

Апартуністычныя скажэньні ў яўрабоце, якія перарасьлі ў правы ўхіл і ў тэорыі, і на практыцы, зьяўляюцца ў першую чаргу адлюстраваньнем націску на асобныя зьвеньні нашых арганізацый і на асобных камуністых клясава-варожых нам сіл. Правы ўхіл у яўрабоце сыгналізуе аб тым, што ўплыў буржуазнай ідэалёгіі, уплыў нацыяналістычнай ідэалёгіі моцны. І што адным з фактараў, які-б вызначыў магчымасьць такіх апартуністычных памылак, зьяўляецца тое, што сярод часткі рабочых і нават часткі партыйцаў яшчэ ня зьнішчаны да канца старыя бундаўскія і іншыя дробна-буржуазныя традыцыі і нацыяналістычныя забабоны. У нашых умовах часта правы ўхіл набывае нацыянал-апартуністычную форму, нацыянал-дэмакратычную афарбоўку. Перад намі стаіць наступная цэнтральная задача—узмацніць агонь па правай небясьпецы ў яўрабоце і ўся работа нарады яўработнікаў павінна праходзіць пад адзнакай рашучай перабудовы ўсяе работы пад кутом выкрыцьця права-апартуністычных памылак і барацьбы з правым ухілам і ў тэорыі, і на практыцы, дзе бы і ў чым бы ён не праяўляўся.

Асноўным зьместам яўработы павінна быць садзейнічаньне партыі мабілізаваць усіх яўрэйскіх рабочых, яўрэйскіх працоўных для сацыялістычнага будаўніцтва, для перамогі труднасьцяй, для барацьбы з клясавымі ворагамі, для барацьбы з валяўнічым клерыкалізмам, для барацьбы з яўрэйскім нацыянал-дэмакратызмам. Трэба спыніць усе пробы ізаляваць партыю цалкам ад непасрэднага кіраўніцтва яўрэйскімі рабочымі, бо наша партыя цалкам лічыць сваім кроўным абавязкам кіраваць яўрэйскімі рабочымі і ўсімі яўрэйскімі працоўнымі, і ўцягваць іх алначасова ў сацыялістычнае будаўніцтва. Адарванасьць яўработы ад агульна-партыйнай работы спрыяла таму, што мы маем такія значныя прарывы ў нашай рабоце.

КП(б)Б у цэлым, усе зьвеньні нашых партыйных арганізацый павінны ўзмацніць сваё непасрэднае кіраўніцтва работай у абслугоўваньні яўрэйскіх працоўных мас. Яўбюро павінна быць такою часткаю партапарату, якая дапамагае ўсёй партыі вырашаць усе патрэбныя пытаньні, зьвязаныя з абслугоўваньнем яўрэйскіх працоўных. Побач з барацьбою супроць усіх проб абярнуць яўбюро ў другую роўналеглую партыю, трэба ўзмацніць барацьбу з ліквідатарскімі настроямі ў адносінах да яўбюро.

Перад нарадай яўработнікаў таксама стаіць вялізная задача ў галіне распрацоўкі асноўных мерапрыемстваў па далейшым далучэньні да прадукцыйнае працы яўрэйскае беднаты, паляпшэньні каапэраваньня саматужнікаў—адзіночак і ўцягненьні яўрэйскіх рабочых у прамысловасьць. Трэба яшчэ ўлічыць пры распрацоўцы гэтых пытаньняў наступнае: усе пытаньні павінны вырашацца пад кутом погляду максымальнага разгортваньня ўсёй гэтай работы. Мы падкрэсьліваем, што ў сувязі з плянамі суцэльнай калектывізацыі сельскае гаспадаркі, перспэктывы гаспадарчае па будовы мястэчак вырасьлі і што форма іх пабудовы павінна быць прыстасавана да новых задач, якія стаяць перад намі ў вёсцы.

Адным з сур'ёзьнейшых пытаньняў, якое перад намі стаіць, зьяўляецца пытаньне аб кадрах. Трэба вылучыць новыя пралетарскія кадры на кіраўнічую работу ва ўсіх арганізацыях. Бальшавіцкая якасьць кіраўнічых кадраў павінна быць палепшана. З гэтым зьвязана пытаньне аб самай энэргічнай барацьбе з ліквідатарскімі і напляваць-ельскімі адносінамі часткі яўрэйскіх камуністых да яўработы. Трэба таксама прапрацаваць цэлую сыстэму мерапрыемстваў па ўзмацненьні пралетарскага ядра сярод культурных і навуковых кадраў. Пытаньні масавай культурнай работы, народнае асьветы, друку таксама павінны вырашацца пад куток забесьпячэньня вытрыманай лініі і сапраўднага прыстасаваньня ўсёй гэтай работы для патрэб сацыялістычнага будаўніцтва. Адным з карэнных недахопаў усёй яўработы зьяўляецца адсутнасьць самакрытыкі, адарванасьць ад шырокіх рабочых мас. Трэба забясьпечыць максымальнае разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі, сувязь з работчымі масамі, прыцягненьне іх да актыўнага ўдзелу ў вырашэньні ўсіх пытаньняў павінна быць забясьпечана. Трэба дабіцца, каб лінія партыі па ўсіх пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва і ў прыватнасьці па пытаньнях ўцягненьня яўрэйскіх рабочых у сацыялістычнае будаўніцтва дайшла бы да кожнага рабочага, да кожнага бедняка, да фабрыкі, да заводу, да калгасу, да арцелі. Трэба мабілізаваць усіх працоўных для спраўленьня дапушчаных памылак, для ачышчэньня калгасаў і арцеляй ад клясава-варожых нам элемэнтаў.

ЗАГАТОУКІ ІЛЬНУ УСЕ ЯШЧЭ ІДУЦЬ СЛАБА

На 16-е сьнежня выканана 45,2 проц. гадавога заданьня. Да апошняга тэрміну застаўся толькі месяц

БАБРУЙСК—НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ. ВОРША, МАГІЛЕУ І МАЗЫР АДСТАЮЦЬ. ПОЛАЦАК НЯ УЗМОЦНІЦЬ ТЭМПАЎ

Раўняйцеся па Бабруйшчыне

На 16-га сьнежня гадавое заданьне па загатоўках ільну-валакна па БССР выканана **на 45,2 проц.**, а месячны плян — на 52,7 проц.

На першым месцы па выкананьні месячнага пляну Бабруйская округа—105 проц. месячнага заданьня; Менская округа выканала 78,9 проц.; Гомельская — 76,6 проц.; Віцебская—63,5 проц.; Аршанская — 43,3 проц.; Магілеўская — 36,5 проц.; Мазырская — 35,6 проц. і на апошнім месцы — Полацкая, якая выканала ўсяго толькі 33,1 проц.

Паказаная вышэй зводка сьведчыць аб тым, што належнага пералому ў загатоўках ільну яшчэ няма. На 1-га студзеня павінна быць выкапана 80 проц. гадавога пляну загатовак, а на 15-га сьнежня мы маем усяго выкананьне гадавога пляну на 45,2 проц. Зразумела, што тэмпы загатовак, якія мы мелі да гэтага часу, зьяўляюцца зусім недастатковымі, месцы павінны прыкласьці ўсе сілы, каб дабіцца ўзмацненьня тэмпу паступленьня ільну.

Асабліва павінна быць зьвернута ўвага на ўзмацненьне тэмпаў загатовак па адстаючых Аршанскай, Магілеўскай і Мазырскай округах. Самая ільнаводная округа Полацкая адстае больш за ўсе іншыя. Партыйныя і грамадзкія арганізацыі павінны прыйсьці на дапамогу загатоўшчыкам і дабіцца рашучага пералому ў загатоўках. Павінна быць узмоцнена работа па вылучэньні рабочых брыгад на загатоўкі ільну. У некаторых округах наглядаюцца выпадкі, калі на мясцох лічаць работу брыгад ужо непатрэбнай і зьнімаюць брыгады. **Гэта зьяўляецца недапушчальным фактам, брыгады павінны застацца да поўнага выкананьня плянаў загатовак на мясцох.**

Трэба адзначыць, што, ня гледзячы на добры ўраджай ільну, апрацоўка яго **ў гэтым годзе значна горшая, чым у мінулым і якасьць здаванага ільну дрэнная.** Вінаватымі ў гэтым зьяўляюцца выключна загатоўшчыкі, якія не зьвяртаюць дастатковай увагі на якасьць здаванага ільну.

Аб злачынна-нядбайных адносінах некаторых нашых арганізацый сьведчаць наступныя факты. Так, Магілеўскі акрсельсаюз 5-га сьнежня паведамляе пізоўку аб тым, што цэны на каноплі такія-ж, як і ў мінулым годзе. Гэта ў той час, калі яшчэ 10-га кастрычніка была разаслана пастанова эканомнарады аб тым, што цэны павышаны на 10 проц.

Зусім дрэнна з паступленьнем ільну па кантрактацыі. Ёсьць рад раёнаў, якія выканалі толькі 1 проц. загатовак ільну па кантрактацыі. Акрсельсаюзы ня ведаюць аб тым, як паступае закантрактаваны лён. Так, Магілеўскі акрсельсаюз 11-га сьнежня мае толькі весткі аб ходзе кантрактацыі на 25-га лістапада.

Трэба адзначыць наогул, што с.-г. каапэрацыя ня справілася з задачамі па кантрактацыі. Так, у Клімавіцкім раёне з 2.000 гэктараў ільнаводнай плошчы закантрактавана толькі ¾ га. Гэта тлумачыцца тым, што авансы па кантрактацыі замест 30 руб. за гэктар, даваліся толькі ў разьмеры 6 рублёў.

Грамадзкасьць у работу па загатоўках ільну амаль што зусім ня ўцягнута.

Трэба адзначыць, што і партыйныя арганізацыі, асабліва нізавыя, не ўдзялілі тэй увагі, якая павінна была быць удзелена загатоўкам ільну.

Няправільнае прэміяваньне эдатчыкаў

Загатоўшчыкі не зьвяртаюць належнай увагі на якасьць ільну

У Менск вярнуўся з паездкі па Магілеўскай і Аршанскай округах адказны прапаўнік Наркамгандлю т. Кізіла, які паведаміў нашаму супрацоўніку аб тым, што робіцца на мясцох пры правядзеньні загатовак ільну.

У першую чаргу зварочвае на сябе увагу позьняе давядзеньне плянаў да вёскі і да асобнай кулацкай гаспадаркі. Так, у частцы сельсаветаў Шклоўскага раёну плян даведзены да вёсак толькі ў канцы лістапада. У паасобных сельсаветах Лупалаўскага раёну 7-га сьнежня пляны яшчэ ня былі даведзены да вёскі і да кулацкай гаспадаркі.

Акрамя гэтага, быў дапушчаны рад памылак і скажэньняў клясавай лініі. У многіх сельсаветах Магілеўскай і Аршанскай округ пляны былі даведзены ня толькі да кулацкай гаспадаркі, але і да паасобных серадняцкіх гаспадарак.

Пляны, вызначаныя раёнамі, сельсаветамі часта зьмяншаліся, гэта ў той час, калі пасеўная плошча, ўраджай ільну даюць поўную ўпэўненасьць у магчымасьці выкананьня даданых ім плянаў.

Вялікія ненармальнасьці назіраюцца на мясцох таксама і ў прэміяваньні эдатчыкаў ільну.

Мануфактурай прэміруюць не у залежнасьці ад колькасьці эданага ільну, а проста кожнаму эдатчыку ільну выдаецца па 7 метраў мануфактуры. Зразумела, што селянін, які-б мог адразу эдаць усе свае лішкі ільну, расьцягвае эдачу іх на некалькі разоў, каб больш атрымаць мануфактуры.

У прамысловых ільнаводных раёнах (Шклоўскі) наглядаецца недахоп у прам тварах, асабліва ў мануфактуры. У Калінінскім раёне таварамі, якія выдзелены выключна для ільнаводаў, прэм'юцца ўсе пайшчыкі.

Першая зводка аб вялікім паходзе

Раёны суцэльнай калектывізацыі шпарка крочаць уперад

Раёны БССР, вылучаныя для суцэльнай калектывізацыі, кожны дзень разгортваюць работу па арганізацыі новых калгасаў. Процант калектывізаванай плошчы па гэтых раёнах расьце з кожным днём. На сёнешні дзень колькасьць калектывізаванай плошчы па гэтых раёнах наступная:

Па Віцебскай акрузе: па Гарадоцкім раёне — 65 проц., Сіроцінскім — 45 проц., Сеньненскім — 50 проц.

Па Гомельскай акрузе: па Лоеўскім раёне — 45 проц., Хойніцкім — 30 проц.

Па Бабруйскай акрузе: па Рагачоўскім раёне — 60 проц. і па Жлобінскім — 60 проц.

Па Аршанскай акрузе: ПА ЛЯДНЯНСКІМ РАЕНЕ — 96 проц., Круглянскім — 55 проц., Расьнянскім —42 проц.

Па Менскай акрузе: па Сьмілавіцкім раёне — 35 проц., Капыльскім — 30 проц.

Па Мазырскай акрузе: па Харавіцкім раёне — 35 проц., Калінкавіцкім — 35 проц.

Магілеўская округа калектывізавана на 25 проц.

Мабілізацыя 500 у калгасы пад пагрозай

Некаторыя ЦП саюзаў яшчэ не абмяркоўвалі гэтага важнага пытаньня

Сыгналы „Зьвязды" былі сваячасовы

«Зьвязда» гэтымі днямі сыгналізавала аб дрэнным становішчы ў справе набору 500 работных для калгасаў. Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў правесьці тэрміновую праверку работы прафсаюзных арганізацый у гэтым кірунку. Праверка паказала, што сыгналы «Зьвязды» былі вельмі сваячасовыя. Некаторыя цэнтральныя праўленьні саюзаў яшчэ да гэтага часу не абмяркоўвалі гэтага пытаньня на сваіх пасяджэньнях. Харчавікі, гарбары, дрэваапрацоўшчыкі, друкары, камунальнікі яшчэ толькі «зьбіраюцца» абмяркоўваць гэта пытаньне. Пакуль што далі дырэктывы толькі нізавым прафарганізацыям. Іншыя саюзы (будаўнікі, швэйнікі, мэталісты, хэмікі, чыгуначнікі) ужо абмеркавалі гэтае пытаньне на пасяджэньнях прэзыдыумаў і далі нізавым праф'ячэйкам расклад, указаньні і... самі супакоіліся, не падумаўшы пра неабходнасьць тэрміновай праверкі гэтай работы на прадпрыемствах.

Як-жа абстаіць справа вылучэньня рабочых на менскіх прадпрыемствах?

Швэйная фабрыка «Кастрычнік». Даручылі шэфтаварыству прапрацаваць гэтае пытаньне. Вывесілі абвестку на фабрыцы аб запісе добраахвотнікаў. Запісаліся 4 чалавекі. Дырэктыўу ад Фрунзаўскага райкому КП(б)Б адносна правядзеньня гэтай работы няма.

Гута «Пралетары». 14-га сьнежня заўком атрымаў паведамленьне ад ЦП хэмікаў, што трэба завербаваць двух чалавек для работы ў калгасах. Больш ніякіх указаньняў ЦП не дало, а «таму нічога ня зроблена».

Завод «Энэргія». Сакратар заўкому выпадкова зайшоў 15-га сьнежня 1929 году ў ЦП саюзу мэталістых і там атрымаў абежнік аб вылучэньні 7-мі рабочых для работы ў калгасах. Адначасова ў парт'ячэйцы атрымалі дырэктыву ад райкому КП(б)Б—вылучыць двух таварышоў. Нічога канкрэтнага для выкананьня дырэктыў не зрабілі. Сакратар ячэйкі КП(б)Б, заспакойваючы інструктара ЦСПСБ, адказаў: «пасьпеем, выканаем не пазьней іншых прадпрыемстваў».

Менскі вучпрафсож атрымаў дырэктыву ад Белбюро ЦК чыгуначнікаў і нібы разаслаў яе па мясцкомах. Зьвярнуўшыся ў мясцком № 2 таварнай, інструктар ЦСПСБ знайшоў, што там дырэктывы ніколі ня было. Па партыйнай лініі ніякіх дырэктыў таксама няма. Прак тычна нічога ня зроблена.

Заводы «Дрэваапрацоўшчык» і «Бальшавік» хаця і сваячасова атрымалі дырэктывы, але канкрэтна нічога не зрабілі.

Завод «Чырвоная Зара». На пасяджэньні бюро парт'ячэйкі вылучыла аднаго рабочага і на гэтым супакоілася. Добраахвотнікаў ня выклікалі.

У 1-й дзярждрукарні правялі толькі адну гутарку з рабочымі ў часе абедзенага перапынку і больш нічога не зрабілі.

У іншых округах—ня лепш. У Воршы справа з наборам рабочых у калгасы яшчэ ня выйшла са стадыі абгаварэньня ў габінэтах. Можна канстатаваць, што заданьне падрыхтаваць рабочых для пасылкі ў калгасы на 1-е студзеня фактычна сарвана. Калі і будуць вылучаны рабочыя ў бліжэйшы тыдзень, то ім неабходна яшчэ прайсьці наротка-тэрміновыя курсы (2-3 тыдні). І вось ад таго, што прапушчана шмат часу, рабочыя ў лепшым выпадку будуць накіраваны ў калгасы не раней 15-га студзеня, або нават і 1-га лютага.

Масавая калектывізацыя патрабуе куды больш шпаркіх тэмпаў, куды больш лепшых мэтадаў работы. Нельга абыйсьці моўчкі і занадта вялікую павольнасьць партыйных райкомаў і ячэек. Вылучэньне рабочых у калгасы праводзіцца па лініі прафсаюзаў. Але ці можна праводзіць такую важную палітычную справу бяз удзелу партарганізацыі. Ня можна. А між тым, праверка паказвае, што большасьць парт'ячэек пакуль што не зразумела сутнасьці і важнасьці ўсёй гэтай работы. Паказваючы на павольнасьць пасылкі рабочых для работы ў калгасах, неабходна адзначыць, што і РК КП(б)Б г. Менску таксама не сьвярнулі належнай увагі на гэту работу. Трэба зараз-жа рашуча ўзяцца за яе.

Калгасы павінны атрымаць пралетараў-кіраўнікоў.

Адчынілася нарада аграрнікаў --марксыстых

Учора раньніцою распачала работу нарада аграрнікаў-марксыстых.

Загадчык АПАД ЦК КП(б)Б т. Сяньковіч, адчыняючы нараду, вызначыў асноўныя задачы, якія належыць ёй вырашыць.

Зацьверджан наступны парадак дня: 1) Аб барацьбе на ідэалёгічным аграрным фронце, 2) Аб барацьбе на ідэалёг. аграр. фронце БССР, 3) Пытаньні зямельнай палітыкі і зям. кодэксу БССР; 4) Аб кадрах сель.-гасп.; 5) Арганізац. пытаньні і выбары дэлегатаў на ўсесаюз. канф. аграрнікаў-марксыстых.

Па першым пытаньні парадку дня з вялікім дакладам выступіў прадст. камакадэміі тав. Взраменічаў.

Па другім — рэктар Бел. сел.-гасп. Акадэміі тав. Пінчук.

Вячэрняе пасяджэньне было прысьвечана спрэчкам па абодвых дакладах. Выступалі т.т. Маркелаў, Карклін, Антанікоўскі ды інш.

Падрабязная справаздача — у заўтрашнім нумары.

ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б)

аб мэдычным абслугоўваньні рабочых і сялян

ЦК УсеКП(б) ухвалена пастанова аб мэдычным абслугоўваньні рабочых і сялян. ЦК лічыць неабходным:

1) Наркаматам аховы здароўя саюзных рэспублік трэба адпаведным чынам перабудаваць усю работу ў галіне аховы здароўя, больш выразна адлюстроўваць у ёй клясавую, пралетарскую лінію. Палепшыць лекавую і прафілактычную дапамогу ў прамысловых цэнтрах, выдзяляючы ў асобную групу асноўныя індустрыяльныя раёны (горная, мэталюргічная прамысловасьць і г. д.). У пяцігадовым пляне аховы здароўя асобна за бясьпечыць мэдыцынскае абслугоўваньне застрахаваных.

У сувязі з пераходам на 7-мігадзінны рабочы дзень і на бесьперапынны вытворчы тыдзень, перабудаваць работу ў лекава-санітарных установах, якія абслугоўваюць патрэбы рабочых (арганізацыя вячэрніх прыёмаў, пашырэньне пунктаў першае дапамогі, зьнішчэньне чаргі ў лекавых установах, арганізацыя ясьляў і д. т. п.).

2) ЦК прапануе наркаматам аховы здароўя саюзных рэспублік вызначыць плян сыстэматычнага вашырэньня сельскае лекавае сеткі. Разгортваньне работы ў вёсцы павінна быць зьвязана з калгасным і саўгасным будаўніцтвам.

3) Прызнаючы неадкладнай задачай карэннае паляпшэньне ў складзе кадраў народнай аховы здароўя, ЦК лічыць неабходным: а) узяць рашучы курс на арабочаньне апарату шляхам вылучэньня ў органы аховы здароўя рабочага і сялянскага актыву; б) канстатуючы значнае накапленьне мэдыцынскіх работнікаў і тых, якія канчаюць мэд. ВНУ, у буйных гарадзкіх цэнтрах і рост недахопу іх у вёсцы, ЦК лічыць неабходным, каб Наркампрацы СССР, сумесна з наркаматамі аховы здароўя саюзных рэспублік і ЦК саюзу мэдсанпрацы правялі ў месячны тэрмін мерапрыемствы, якія забясьпечваюць скарыстаньне гэтых работнікаў у вёсцы.

4) Улічваючы надзвычай слабы ўдзел савецкай грамадзкасьці ў справе аховы здароўя, ЦК падрэсьлівае неабходнасьць большага ўдзелу савецкіх, прафсаюзных і страхавых арганізацый у справе арганізацыі аховы здароўя, шляхам ажыўленьня работы сэкцый саветаў па ахове здароўя, шляхам ажыўленьня дзейнасьці эканомнарад органаў аховы здароўя, заахвочваньня сацыялістычнага спаборніцтва і большага прыцягненьня да работы калегацкіх сходаў работніц і сялянак.

Адначасова ЦК лічыць, што наркаматы аховы здароўя саюзных рэспублік павінны правесьці рашучую барацьбу за падняцьце працоўнае дысцыпліны сярод мэдыка-санітарных работнікаў, а ЦК саюзу мэдсанпрацы—прыцягненьнем мэдработнікаў да сац. будаўніцтва (удзел у эканомрабоце, у сацспаборніцтве і г. д.), усямерна ўзмацняючы ў іх радох працоўную дысцыпліну. У той-жа час УсеЦСПС павінен узмацніць барацьбу сярод членаў прафсаюзаў з нетаварыскімі адносінамі да дактароў з боку хворых.

НАСТУПЛЕНЬНЕ НА ЖЫЦЬЦЕВЫ УЗРОВЕНЬ ПРАЦОУНЫХ МАС У НЯМЕЧЧЫНЕ

Павышэньне мытных тарыфаў на прадметы шырокага спажываньня

САЦ.-ФАШЫСТЫЯ Ў РОЛІ ВЫКАНАЎЦАЎ ВОЛІ КАПІТАЛУ

БЭРЛІН, 17. Сыстэматычнае наступленьне на жыцьцёвы ўзровень шырокіх мас, якое пачалося ў зьвязку з плянам Юнга, адбываецца далей узмоцненым тэмпам. Зараз-жа пасьля ўхвалы асноўных палажэньняў фінансавага пляну ў рэйхстагу пачаліся перагаворы аб новых прапановах, якія прадугледжваюць павышэньне мытных тарыфаў. Гэтае павышэньне, якое складае 1,8 міл. марак, пляжа цяжарам на плечы працоўным, бо мяркуецца накласьці мыта на пшаніцу, жыта, масла, яйкі, абутак і алюміневыя вырабы.

Акрамя таго, бэрлінская гарадзкая ўправа пастанавіла ўчора галасамі ўсіх партый супроць камуністых павысіць да 1-га студзеня цэны на абутак на 33 ⅓ проц., на электрычнасьць—на 25 процантаў, на газ—12½ проц. Акрамя таго, пастаноўлена павысіць на 25 проц. праезны тарыф па гарадзкіх дарогах.

Павышэньне тарыфу наступіла пасьля таго, як старшыня рэйхсбанку Шахт здмовіўся гарантаваць амэрыканскі крэдыт у 15 міл. долараў, які патрэбны бэрлінскай гарадзкой управе. Пазыцыя Шахта строга адпавядае патрабаваньням прамысловасьці і фінансавага капіталу, якія імкнуцца давесьці нерэнтабэльнасьць камунальных прадпрыемстваў у параўнаньні з царскімі. Сац.-дэмакраты ў сваю чаргу выступаюць паслухмянымі выканаўцамі патрабаваньняў Шахта.

«ФІНАНСАВАЯ РЭФОРМА» ГЕРМАНСКІХ САЦ. ФАШЫСТЫХ

Праект «пяцігодкі» Гільфэрдынга

Клясавыя баі францускага пралетарыяту

МАГУТНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ РАБОЧЫХ У МАРСЭЛІ

ПАРЫЖ, 16. Учора ў Марсэлі адбылася вялікая дэманстрацыя рабочых пад кіраўніцтвам кампартыі. Дэманстрацыя была арганізавана з мэтай адзначыць памяць расстрэлянага ў Марсэлі 30-га лістапада 1871 г. вэрсальскім генэралам рабочага-камунара Крэм'е.

АРЫШТЫ КАМУНІСТЫХ У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 15. Учора ў Парыжы арыштаваны супрацоўнік «Юманітэ»—Калас за антымілітарысцкі артыкул. У Бардо арыштаваны сакратар акругкому кампартыі Жубэр, якога абвінавачваюць «у падбухторваньні салдат да няпослуху». Учора ў рабочым квартале Парыжу ў той час, калі яшчэ 10-га кастрычніка была разаслана пастанова эканомнарады аб тым, што цэны павышаны на 10 проц.

ЗАБАСТОЎКА ПЕКАРОЎ У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 16. Учора ў Парыжы пад кіраўніцтвам унітарнага прафсаюзу пекароў пачалася забастоўка, у якой прымае ўдзел каля 600 пекароў буйнейшых цукерных прадпрыемстваў.

Учора, у 25-ты дзень забастоўкі мэталістых у Гізе, адбыўся мітынг 2.000 бастуючых, якія аднагалосна ўхвалілі рэзалюцыю аб працягу барацьбы да перамогі. (ТАСС).

ПАРЫЖ. З раду месц паступаюць паведамленьні аб новых эканамічных забастоўках. На вагонным заводзе, недалёка ад Валансьене, 200 маладых рабочых ва ўзросьце ад 18 да 21 год аднадзённай забастоўкаю дабіліся павышэньня зарплаты. У Лільскім раёне

АДКРЫЛАСЯ 6-я СЭСІЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА САВЕТУ ПРАФІНТЭРНУ

КРАХ ЛЕГЕНДЫ АБ СТАБІЛІЗАЦЫІ І АРГАНІЗАВАНЫМ КАПІТАЛІЗМЕ

З дакладу тав. ЛАЗОЎСКАГА

МАСКВА. 16-га вечарам у залі прафсаюзаў адкрылася 6-я сэсія Цэнтральнага Савету Прафінтэрну.

Генэральны сакратар Прафінтэрну т. Лазоўскі, адкрываючы сэсію, запрапанаваў ушанаваць уставаньнем памяць 2-х памерлых членаў Цэнтральнага Савету — т.т. І. І. Лепсэ і Су Чжоучжэна. Усе ўстаюць.

Па прапанове т. Воткінса, сэсія пастанавіла паслаць ад імя Цэнтральнага Савету прывітаньне ўсім рэвалюцыйным барацьбітом, зьняволеным у капіталістычных турмах. Потым сэсія пераходзіць да дзеляове работы.

Па першым пытаньні — аб выніках і пэрспэктывах эканамічных баёў, выступіў з дакладам т. Лазоўскі. Даючы агульную характарыстыку эканамічнага крызісу ў Амэрыцы, які абвастрыў гаспадарчае становішча раду яўрапэйскіх краін (Польшча, Аўстрыя, Чэха-Славакія і г. д.), тав. Лазоўскі гаворыць, што гэтыя падзеі нанесьлі зьнішчаючы ўдар буржуазна-рэфармісцкай тэорыі аб арганізаваным капіталізьме. Эканамічны крызіс выявіў і няўстойлівасьць капіталістычнай стабілізацыі і яшчэ ў большай ступені абвострыў клясавыя супярэчнасьці. Рабочая кляса пераходзіць намічны характар, маюць палітычны характар.

Далей т. Лазоўскі спыняецца на пытаньні аб кіраўніцтве эканамічнымі баямі.

Абвастраньне клясавых баёў выклікала хістаньні ў некаторых сэкцыях Прафінтэрну. Апартунізм прыкрываецца левай фразэалёгіяй і выступае пад тым прадлогам, што пасьпяхоныя баі асуджана на няўдачу. Такі пункт погляду глыбока шкодны і небясьпечны, бо ён адцягвае рабочых ад канкрэтнай барацьбы.

17-га з раніцы — судаклад т. Мерцава.

МАСКВА. На ранішнім пасяджэньні 17-га сьнежня 6-ай сэсіі Цэнтральнага Савету Прафінтэрну быў заслухан даклад т. Мерцава аб забастоўчай барацьбе.

Дакладчык зьвяртае ўвагу цэнтральнага савету на адсутнасьць патрэбных кадраў на арэне міжнароднага рэвалюцыйнага прафруху. Гэтыя кадры трэба ўзяць з прадпрыемстваў, з забастоўных камітэтаў і з пасярод актыўных барацьбітоў рэвалюцыйнага прафруху. Эканамічныя баі ўцягваюць у рады рэвалюцыйных прафсаюзаў сотні тысяч

Узмацненьне палкоўніцкай групы ў Польшчы

ВАРШАВА, 15. Урадавы крызіс у Польшчы, відавочна, пераходзіць у хранічную стадыю. Як ужо адзначалася, урад імкнецца зацягнуць крызіс наймей да калядных канікул, якія працягваюцца ня менш двух тыдняў. Апазыцыйныя колы ў прымеркаваньні былога прэм'ера Бартэля бачаць сымптом узмацненьня тае групы пілсудчыкаў, якая адносіцца да сойму прымірэнча і ўвесь час змагаецца з улывам «прыстарыянцаў», г. зн. палкоўніцкай групы, на чале якое стаяць Прыстар і Славек. Надзеі апазыцыі на Бартэля аказаліся заўчаснымі. Бартэль пасьля нарады з прэзыдэнтам Масьціцкім і Пілсудзкім неадкладна выехаў назад у Львоў, хаця спачатку меркаваў застацца ў Варшаве на некалькі дзён.

У гутарцы з журналістымі Бартэль намякнуў, што ня трэба забываць, што рашаючым фактарам у Польшчы зьяўляецца маршал Пілсудзкі. Бартэль, такім чынам, давёў да ведама апазыцыі, што яе надзеі на яго ня маюць ніякага грунту. У дзень ад'езду Бартэля Сьвітальскі выступіў з публічным дакладам, у якім зьдзекваўся з апазыцыі і сойму і падкрэсьліў, што вотум недавер'я зьявіўся вялікай паслугай для пілсудчыкаў, бо для краіны цяпер ясна настойлівая неабходнасьць рэвізіі канстытуцыі. Перад сваім выступленьнем Сьвітальскі быў прыняты Пілсудзкім. У сувязі з гэтым лічаць, што палкоўніцкая лінія атрымала бясспрэчную перамогу.

Катаржны прысуд па справе 11 у Беластоку

14-га сьнежня Беластоцкім акруговым судом вынесены прысуд па справе 11-ці чалавек па абвінавачваньні, нібы, у прыналежнасьці да акруговага камітэту кампартыі Зах. Беларусі. Абвінавачаны Маняюк засуджаны на 8 год; Яблонка, Надзея Фэрэльштайн і Бародка—на 6 год

Памёр прэзыдэнт УАН і акадэмік БАН Забалотны

Гэтымі днямі намёр прэзыдэнт Украінскай Акадэміі Навук і правадзейны член Беларускай Акадэміі Навук праф. Забалотны.

У бліжэйшыя дні адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму Беларускай Акадэміі Навук, прысьвечанае сьмерці Забалотнага.

Прэзыдыуму Украінскай Акадэміі Навук

Беларуская Акадэмія Навук выказвае шчыры і глыбокі жаль у сувязі са сьмерцю прэзыдэнта Украінскай Акадэміі Навук і правадзейнага члена нашай Акадэміі.

Прэзыдэнт БАН ІГНАТОЎСКІ.

Акадэмік Д. К. Забалотны

Беларуская Акадэмія Навук атрымала сумную вестку аб сьмерці свайго правадзейнага члена, прэзыдэнта Украінскай Акадэміі Навук, правадзейнага члена Усесаюзнай Акадэміі Навук, члена ВУДВК і ЦВК СССР, вядомага эпідэміялёга Данілы Кірылавіча Забалотнага.

Д. К. Забалотны нарадзіўся ў 1866 г., скончыў фізыка-матэматычны факультэт у Адэсе ў 1889 г. і мэдычны факультэт у 1894 г. у Кіеве.

Шырока вядомымі зрабіліся яго вопыты імунізаваньня самога сябе халернымі забітымі вібрыёнамі, самахтырныя і небясьпечныя вопытам праглынальні жывых вірулентных халерных вібрыёнаў (1893 г.). У 1897 г. ён вывучаў чуму ў Індыі, дзе працаваў супольна з вядомымі дасьледчыкамі Іерсэнам і Хаўкінам, а таксама нямецкай і аўстрыйскай экспэдыцыямі. Далей ён прымаў удзел у навуковых экспэдыцыях у Арабію, Кітай, Манголію, Пэрсыю і Казахстанскія стэпы.

У 1905 г. вывучаў эпідэміялёгію халеры на Волзе і ў Пецярбурзе. Шмат прац (агульная колькасьць больш за 80) зроблена таксама акад. Забалотным і па іншых інфэкцыях. Набожчык выдаў таксама і шэраг папулярных брашур па эпідэміялёгіі.

Д. К. Забалотны быў заснаваўцам і гапаровым членам Мікрабіялёгічнага т-ва ў Ленінградзе, ганаровым членам Мікрабіялёгічнага т-ва ў Вене, членам-заснаваўцам Міжнароднага т-ва мікрабіялёгаў, членам т-ва на вывучэньні трапічнае паталёгіі ў Парыжы. Пры заснаваньні Беларускай Акадэміі Навук, у пачатку бягучага году, ён абраны яе правадзейным членам.

Галоўнымі працамі яго зьяўляюцца «Матар'ялы аб чуме ў Індыі», «Досьледы па чуме» (Архіў Біялёг. Навук 1899 г.), «Халерная эпідэмія 1908-1909 г. у Пецярбурзе». Дысэртацыя яго напісана на тэму «К вопросу о патогенезе сифилиса» (1909 г. Пецярбург).

Сьмерць Данілы Кірылавіча Забалотнага зьяўляецца вялікай стратай для навукі наогул, у асаблівасьці для Украінскай і Беларускай Акадэміі; яго арганізацыйны вопыт і навуковая праца шмат яшчэ маглі-б дапамагчы разгортаньню гэтых маладых асяродкаў навукі, створаных воляю пралетарыяту.

ПРЭЗЫДЫУМ БАН.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

ПЕРШАЯ ЎДАРНАЯ БРЫГАДА ЖУРНАЛІСТЫХ

ЛЕНІНГРАД, 16. У рэдакцыі «Красной газеты» стварылася першая ўдарная брыгада журналістых. Брыгада ўзяла на сябе абавязак устанавіць максымальную сувязь з рэдкалегіямі заводзкіх газэт, павысіць сваю кваліфікацыю і быць прыкладам для ўсіх супрацоўнікаў ленінградзкіх газэт.

ШТО БУДУЕ «СОВХОЗТРЕСТ»

«Совхозтрест» восеньню прыступіў да арганізацыі 6 буйных саўгасаў: «Бальшэвік»—Цьвярское акругі, Шыпаўскі—Разанскай акругі, Лухоўцы—Каломенскай акругі, Сярпухоўскі—Сярпухоўскай акругі, Медзьвенкі—Тульскай акругі і Кудзінава—Маскоўскай акругі. Агульная плошча саўгасаў—45.800 гэктараў. Напрамак гаспадаркі гэтых саўгасаў або малочны, або гародна-малочны. Земляўпарадкаваньне іх у большасьці ўжо закончана. У гэтых саўгасах «Совхозтрест» мяркуе выдаткаваць на капітальнае будаўніцтва 4.175.000 рублёў.

АРГАНІЗУЮЦЦА ІЛЬНЯНЫЯ САЎГАСЫ

«Совхозтрест» часова ўзяў на сябе і арганізацыю двух ільняных і аднаго канаплянага саўгасу на плошчы ў 41 тыс. гэктараў. Адзін ільняны саўгас арганізуецца ў Цьвярскай акрузе на 9 тысячах гэктарах, другі—у Бежыцкім—на 24 тысячах гэктараў. Канапляны саўгас будзе ў Разанскай акрузе, у Сасаўскім раёне і зойме 8 тысяч гэктараў.

МОСПО БУДУЕ Ш�эСЬЦЬ САЎГАСАЎ

Спажывецкая кааперацыя прыступіла да арганізацыі 6 саўгасаў на плошчы ў 16.540 гэктараў. Уся гэта плошча ўжо адведзена МОСПО, пры чым у 2 саўгасах закончана і зямлеўпарадкаваньне, у рэшце саўгасаў яно пакуль яшчэ ня дзедзіца.

Галоўную ўвагу МОСПО зьвярнуў на Клыменцьеўскі саўгас, Маскоўскай акругі, які займае 4.200 гэктараў. У апошніх 5 саўгасах МОСПО: Фаўстава, Каломенскай акругі, на 5 тысячах гэктарах, Літвінага Маскоўскай акругі—у 700 гэктараў, Сестрынскім, тае-ж акругі—на 5 тыс. гэктарах, у Каломенскім—у 540 гэктараў і Бароўскім, Калускай акругі—на 1.100 гэктарах, работы пакуль зроблена мала

САЎГАСЫ ЗЕРНЯТРЭСТУ

За Зернятрэстам для буйных зерняса ўгасаў Маскоўскім земельным аддзелам пакуль замацаваны 2 земельных масывы—Краснахолмскі, Бежыцкай акругі,—у 20 тысяч гэктараў і Арэхава-Зуеўскі—у 21 тыс. гэктараў. Апрача таго, працуе асобая камісія ў Бежыцкай акрузе па дасьледваньні вучасткаў зямлі для зернясаўгасаў плошчаю ў 60-80 тысяч гэктараў. На адным з гэтых вучасткаў ужо з вясны будзе прыступлена да падрыхтоўкі 10 тысяч гэктараў папароў.

ДВА САЎГАСЫ «ПРАДУКТАПЕРАПРАЦОЎКІ»

Акцыянэрнае таварыства «Прадуктапераапрацоўка» замацавала за сабою ў Маскоўскай вобласьці два зямельныя масывы: адзін у 650 гэктараў у Тульскай акрузе, другі—у 1 тысячу гэктараў—у Арэхава-Зуеўскай акрузе. На гэтых масывах будуць арганізаваны 2 малочна-гародныя саўгасы.

Саўгас у Тульскай акрузе будзе арганізаваны пры Белеве на гарадзкіх землях. Пад агародамі тут будзе занята 400 гэктараў. Апошнія 250 гэкт. адводзяцца пад арганізацыю малочнага гурту ў 200 галоў. На гэты саўгас «Прадуктапераапрацоўка» думае выдаткаваць 700 тысяч рублёў.

САЎГАС МАЛАКОСАЮЗУ

Малакосаюз узяў хадайніцтва перад МОЗО аб замацаваньні за ім вучастку ў 1.400 гэктараў у Каломенскай акрузе для арганізацыі фэрмы па гадоўлі племяннога маладняку. Вучастак гэты знаходзіцца ў 20 кілёмэтрах ад Каломны і ў 12 кілёмэтрах ад Азер.

Увесь гэты вучастак Малакосаюз мяркуе разьдзяліць на 4 часьці: аснаўны—у 400 гэкт., 2—на 200 гэктараў і 1—у 300 гэктараў. На асноўным вучастку будзе знаходзіцца малочнае быдла і цялята да 6-мясячнага ўзросту (усяго 500 кароў і да 500 цялят). На апошніх вучастках будзе знаходзіцца маладняк ад 6-мясячнага ўзросту да апяленьня. Гэтага маладняку будзе каля 1.300 галоў.

БУЙНЫЯ ПАКЛАДЫ ЖАЛЕЗНАЕ РУДЫ

ЛЕНІНГРАД. У Карэліі выяўлены раён (Туломазерскі) з пакладамі жалезнае руды на працягу 25 кілёмэтраў з поўначы на поўдзень і на 10 кілёмэтраў з захаду на ўсход.

У сувязі з гэтым урад Карэліі пастанавіў неадкладна прыступіць да аднаўленьня Туломазерскага чыгуннага заводу і пабудовы чыгуначнае веткі Тулом—Озера—Петразаводзк.

Амэрыканскі журналіст аб СССР

«САВЕЦКІ ЎРАД УМЕЕ АТРЫМЛІВАЦЬ ПЕРАМОГІ»

ЛЁНДАН, 14. Выступаючы з прамовай на сьнеданьні, зробленым амэрыканскімі журналістымі ў Лёндане, Рой Говард (старшыня газэтана трэсту «Скрыпс-Говард»), падзяліўся сваімі ўражаньнямі аб паездцы ў СССР.

Говард заклікаў ангельскі і амэрыканскі друк «расказаць усьму сьвету праўду аб СССР».

Говард прызнаў што да паездкі ў СССР па меншай меры 95 проц. усіх яго ведаў аб СССР былі абсалютна няверны.

— Усе дзелавыя людзі павінны прызнаць,—сказаў Говард,-што саветы стварылі ўрад, які ўмее атрымліваць перамогі. Масы любяць савецкі ўрад.

ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ САМАКРЫТЫКУ У КАМСАМОЛЬСКІМ ДРУКУ

Ударыць па тых, хто выступае супроць самакрытыкі

Частка кіраўнічых працаўнікоў Менскай арганізацыі ЛКСМБ цкавала групу асноўных работнікаў «Чырвонай Зьмены» за тое, што апошнія разгортвалі самакрытыку на старонках газэты, выкрываючы канкрэтныя памылкі і прарывы. Бюро ЦК і Мен. АК ЛКСМБ ня ўдарылі па гэтым скажэньні і апаганеньні самакрытыкі, не воудзілі тых, хто супрацілёўся разгортаньню яе на старонках «Чырвонай Зьмены».

Шырока разгортаючы масавую самакрытыку наўкола работы рэдакцыі «Ч. З.», будзем ня ўхільна выкрываць усялякія спробы апаганіць і аказіць гэту самакрытыку, скарыстаць яе ў асабістых інтарэсах.

Што пастанавіў прэзыдыум ЦКК КП(б)Б

Мы ў папярэднім артыкуле («Супроць паходу на самакрытыку», «Зьвязда» ад 16-га сьнежня) ужо спыняліся на справе, якая ўзьнікла наўкола газэты «Чырвоная Зьмена» і групы яе асноўных работнікаў.

Зараз прэзыдыум ЦКК КП(б)Б прыняў пастанову па гэтай справе, ухваленую бюро ЦК партыі. Прэзыдыум ЦКК канстатаваў, што:

«Справа, якая ўзьнікла наўкола «Ч. З.» і групы яе асноўных работнікаў, аб'ектыўна зьяўляецца вынікам недавальненьня часткі кіраўнічых камсамольскіх работнікаў пачатай у газэце крытыкай недахопаў. Гэта сыгналізуе аб слабым усьведамленьні значэньня і сутнасьці самакрытыкі ў друку з боку часткі камсамольскіх актывістых».

Да гэтага сыгналу павінна прыслухацца ўся камсамольская арганізацыя, тым больш, што:

«Гэтыя нездаровыя адносіны да рэдакцыі асабліва выявіліся ў сувязі з крытыкай з боку «Ч. З.» недахопаў асобных актывістых і работы некаторых ячэек і арганізацый і набылі характар зусім недапушчальнага цкаваньня групы яе (газэты) асноўных работнікаў».

Мы ўжо адзначылі, што гэта прымусіла групу асноўных работнікаў «Ч.З.» (т. т. Лабадаеў, Саковіч, Сучкова—члены партыі, Каліта, Гарбуз — камсамольцы) падаць заяву ў бюро ЦК камсамолу Беларусі, у якой былі сабраны канкрэтныя факты недапушчальных адносін да газэты і цкаваньня групы яе асноўных работнікаў з боку часткі кіраўнічых работнікаў Менскай арганізацыі ЛКСМБ. Усе факты, паданыя ў заяве, у асноўным пацьвердзіліся. Афіцыйнае расьсьледваньне паказала наяўнасьць сыстэмы цкаваньня групы асноўных работнікаў «Ч. З.», якія праводзілі правільную самакрытыку, з боку некаторых членаў Менскага акругкому камсамолу, «пакрыўджаных» гэтай самакрытыкай. Формы і мэтады гэтага цкаваньня часамі ператвараліся ў яўныя зьдзекі з групы асноўных работнікаў «Ч. З.», у імкненьне дыскрэдытаваць гэтых камсамольскіх журналістых. Асобныя члены АК камсамолу з лягеру «пакрыўджаных» самакрытыкай праводзілі супроць групы работнікаў «Ч.З.» за іх курс на няўхільнае выкрыцьцё канкрэтных недахопаў і правільнае і патрэбнае разгортваньне самакрытыкі, адкрытую кампанію, кідаючы на іх адрасе брыдкія і ганебныя пяяжкія абвінавачаньні. У пастанове ЦКК па гэтым пытаньні гаворыцца, што: «Абвінавачаньні супроць газэтных работнікаў «Ч. З.» у прыватнасьці, супроць т. т. Гарбуза і Каліты, зьяўляюцца беспадстаўнымі і таму лічыць іх рэабілітаванымі».

Гэтыя абвінавачаньні, абвергнутыя і выкрытыя ЦКК, выразна сьведчаць аб тым, наколькі няправільна асобныя кіраўнічыя работнікі Менарганізацыі ЛКСМБ зразумелі задачы самакрытыкі, наколькі яны сказілі і апаганілі яе асноўныя прынцыпы, наколькі няўмна гэтыя работнікі рэагавалі на правільнае разгортваньне самакрытыкі і крытыкі недахопаў саюзнай работы і асобных актывістых, узьнятае на старонках «Ч. З.».

Бюро Менскага АК ЛКСМБ ня ўлічыла, што гэтыя факты зьяўляюцца недапушчальным скажэньнем і апаганеньнем самакрытыкі, па якіх трэба было жорстка ўдарыць. Бюро нерашуча рэагавала на тое, што ў адказ на правільную самакрытыку з боку групы асноўных работнікаў рэдакцыі, частка членаў АК ЛКСМБ (т. т. Выменіц, Гасьперскі, Гайдукевіч, Райцэс, Штэйнгардт і інш.) праводзіла адкрытае цкаваньне і дыскрэдытацыю гэтых работнікаў, прычым у ход былі пушчаны ўсе сродкі, якія часамі пераходзілі ўсе межы (карыстаньне заведама інжывымі весткамі для асабістай дыскрэдытацыі групы работнікаў «Ч. З.»). Сваім нерашучым і несваячасовым рэагаваньнем на гэта бюро патурала цкаваньню работнікаў газэты. І невядома, у якія-б, нарэшце формы вылілася гэтае цкаваньне, калі-б работнікі «Ч. З.» не паставілі рубам пытаньне аб беспадстаўнасьці і недапушчальнасьці наскокаў на рэдакцыю і яе работнікаў з боку «пакрыўджаных» самакрытыкай і не давялі-б гэтае пытаньне да ведама ЦКК. Той факт, што Фрунзаўскі РК ЛКСМБ і бюро Мен. АК камсамолу ўхвалілі пастановы аб... датэрміновай чыстцы работнікаў «Ч. З.» добра падкрэсьлівае, што сыстэма цкаваньня групы асноўных работнікаў «Ч. З.» іншы раз умацоўвалася афіцыйна данымі кіраўнічымі органамі.

Мы, як і ў мінулым артыкуле, яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліваем, што наўкола «Ч. З.», як і наўкола ўсяго партыйна-камсамольскага друку, павінна быць разгорнута самая шырокая самакрытыка і масавая крытыка. І гэта зьяўляецца асабліва актуальным і патрэбным, бо «Ч. З.» мела асобныя памылкі (нэйтральная пазыцыя ў барацьбе з нацыянал - дэмакратызмам). Але ў даным канкрэтным выпадку мела месца ня «правільная і патрэбная, здаровая самакрытыка работы «Ч. З.» і яе работнікаў, а адкрытае і абураючае цкаваньне групы асноўных работнікаў «Ч. З.» з боку часткі камсамольскіх кіраўнічых работнікаў Менску ў адказ на правільнае разгортваньне самакрытыкі гэтымі журналістымі на старонках «Ч. З.». З такім скажэньнем самакрытыкі трэба бязьлітасна змагацца.

Партыя і камсамол заўсёды жорстка і рэзка асудзяць тых, хто скажае прынцыпы самакрытыкі, хто цкуе і дыскрэдытуе асобных таварышоў за іх правільнае і патрэбнае разгортваньне самакрытыкі на старонках друку.

У даным выпадку бюро Мен. АК ЛКСМБ гэтага не зрабіла, фактычна стаўшы на чале гэтага цкаваньня, і таму прэзыдыум ЦКК пастаналіў: «Бюро Менскага АК камсамолу за нерашучае рэагаваньне на недапушчальныя адносіны да «Ч. З.» і яе работнікаў з боку часткі членаў АК ЛКСМБ і асобных камсамольскіх актывістых — абвясьціць вымову».

Якую-ж ролю адыграла пры вырашэньні гэтае справы бюро ЦК ЛКСМБ? Мы ўжо адзначалі, што бюро несваячасова ацаніла палітычную сутнасьць гэтага пытаньня, што ў сваю чаргу прывяло да таго, што бюро ЦК камсамолу старога складу ўзяло няверную лінію пры вырашэньні справы, якая ўзьнікла наўкола «Ч. З.» і групы яе работнікаў. Гісторыя гэтай справы і прычыны, якія яе выклікалі, выразна падкрэсьліваюць памылковасьць лініі бюро ЦК камсамолу ў даным канкрэтным пытаньні. Ня гледзячы на сыгналізацыю ў папярэдніх заявах асобных работнікаў «Ч. З.» «бюро і сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Галавач абмежаваліся рэагаваньнем толькі на асобныя моманты, не пастаўіўшы гэтага пытаньня ва ўсёй яго прынцыповай велічыні на вырашэньне бюро ЦК камсамолу».

І гэта ў той час, калі факты цкаваньня групы асноўных работнікаў «Ч. З.» з боку асобных членаў Мен. АК ЛКСМБ вырасьлі ў пэўную сыстэму, якая, нарэшце, дасягнула свайго апагею і набыла характар бесшабашнай расправы над газэтнымі работнікамі «Ч. З.» на адным з пасяджэньняў бюро Менскага акругкому камсамолу.

Бюро ЦК камсамолу дапусьціла памылкі, не ацаніўшы і не папярэдзіўшы такога недапушчальнага цкаваньня групы работнікаў «Ч. З.», не аказаўшы своячасовага падтрыманьня рэдакцыі. Таму «такія адносіны бюро ЦК камсамолу да свайго органу зьяўляюцца недапушчальнымі».

Тры разы разглядалася гэта справа на пасяджэньні бюро ЦК ЛКСМБ. Пры першым разглядзе бюро ЦК камсамолу вылучыла камісію для расьсьледваньня фактаў, паданых у заяве. Камісія ўсе факты ў асноўным пацьвердзіла і прапанавала абвясьціць вымову бюро Мен. АК ЛКСМБ за нерэагаваньне і дапушчэньне гэтых фактаў. Але да абмеркаваньня вынадаў камісіі асобныя члены бюро ЦК ЛКСМБ падыйшлі тэндэнцыйна. У гэтым напрамку бязумоўна заспугоўвае асуджэньня пазыцыя загадчыка АПАД ЦК ЛКСМБ тав. Шоламава, на якую ён стаў пры вырашэньні гэтае справы на бюро ЦК камсамолу. Моўчкі абыходзячы канкрэтныя факты цкаваньня групы асноўных работнікаў «Ч. З.» в боку часткі членаў Мен. АК ЛКСМБ, т. Шоламаў у сваім выступленьні на бюро ЦК камсамолу, гаворачы аб «суб'ектыўным» і «надзвороным» характары заявы работнікаў рэдакцыі, галоўныя факты якое цялкам і поўнасьцю пацьвердзілі, імкнуўся прынізіць і змазаць палітычную сутнасьць гэтае справы. Зусім правільна зрабіла ЦКК, калі адзначыла ў сваёй пастанове, што «т. Шоламаў побач з іншымі асобнымі членамі бюро ЦК камсамолу недаацаніў значэньня гэтай справы і імкнуўся змазаць яе палітычную сутнасьць».

Ня дзіва, што пры такіх настроях асобных членаў бюро на пасяджэньні бюро ЦК камсамолу вывады камісіі падлегілі «кастрацыі». Ва ўступным пункце пастановы па гэтай справе бюро ЦК ЛКСМБ дало правільную кваліфікацыю яе (справы) палітычнай сутнасьці, але ўся рэшта пунктаў пастановы не асуджае як учынкаў асобных актывістых у адносінах да рэдакцыі, так і няправільную лінію ЦК і АК камсамолу ў гэтай справе.

Замест гэтага ў мэтах «абалянсаваньня», як гаворыцца ў пастанове ЦКК, у пастанову бюро ЦК ЛКСМБ быў уключаны рад абвінавачаньняў супроць газэтных работнікаў, што абясцэньвае ўвесь палітычны сэнс пастановы ЦК ЛКСМБ.

Нельга не адзначыць, што пры зацьвярджэньні пастановы бюро ЦК камсамолу на пасяджэньні бюро, члены бюро ЦК жорстка асудзілі газэтных работнікаў, якія выступілі з пратэстам супроць «кастрацыі» першых вывадаў камісіі на гэтай справе і прыніжэньня яе (справы) сапраўднай палітычнай сутнасьці. Між тым, гэты пратэст меў пад сабой поўныя падставы і зьяўляўся вусім правільным. Аб гэтым сьведчыць кваліфікацыя пастановы бюро ЦК камсамолу прэзыдыумам ЦКК.

Ясна, што бюро ЦК ЛКСМБ старога складу пры вырашэньні справы, якая ўзьнікла наўкола газэты «Ч. З.» і групы яе асноўных работнікаў, стала на памылковую пазыцыю і не ўзьняло вырашэньне гэтага пытаньня на належную прынцыповую вышыню.

Бюро ЦК камсамолу Беларусі не асудзіла рэзка і рашуча пабальшавіцку цкаваньня і абураючых адносін да групы асноўных работнікаў «Ч. З.» з боку асобных кіраўнічых камсамольскіх работнікаў Менску, якія (цкаваньне і абураючыя адносіны) зьявіліся вынікам шырокай крытыкі і самакрытыкі, узьнятай гэтымі журналістымі на старонках «Ч. З.».

У сьвятле гэтых фактаў зусім правільнай зьяўляецца пастанова прэзыдыуму ЦК КП(б)Б аб абвяшчэньні вымовы бюро ЦК ЛКСМБ у складзе яго асноўных работнікаў т. т. Галавача, Шалімы, Шоламава, Рубіна, Шыфа, Папянкова, Джэлюка, Буклей і Карнеева.

Камсамольскае кіраўніцтва павінна ўлічыць тыя палітычныя вывады, якія вынікаюць з гэтае справы. Трэба гэтыя вывады шырока абмеркаваць па камсамольскіх арганізацыях Беларусі, завастрыўшы ўвагу камсамольскіх мас на патрэбнасьці разгарнуць масавую самакрытыку наўкола камсамольскай прэсы.

На гэту задачу ЦКК асабліва зьвяртае ўвагу ЦК і АК ЛКСМБ і рэдакцыі «Ч. З.» у сваіх палітычных прапановах для далейшага ўзмацненьня «Ч. З.», як «важнейшага вагара самакрытыкі і правадніка бальшавіцкай партыйнасьці ў камсамоле.

Трэба мабілізаваць нашу ўвагу на яшчэ большае разгортваньне самакрытыкі наўкола газэты і работы яе працаўнікоў зьнізу, з боку камсамольскіх мас.

«Пры гэтым трэба дабівацца, каб масавую крытыку газэты сапраўды зрабіць магутным сродкам і адзіным мэтадам далейшага паляпшэньня газэты і ўсёй саюзнай работы, даючы жорсткі і рашучы адпор усялякім спробам апаганеньня самакрытыкі і скарыстаньня яе ў асабістых мэтах «пакрыўджанымі» крытыкай. Для дыскрэдытацыі газэты і яе работнікаў». (З пастановы ЦКК).

Гэта павінны добра запамятаць тыя, хто супрацілёўцца разгортваньню самакрытыкі, як толькі самакрытыка пачынае біць на іх уласных недахопах, хто скажае прынцыпы самакрытыкі і прабуе скарыстаць іх у сваіх асабістых інтарэсах.

Г.

Працаўнікі друку патрабуюць бязьлітаснага пакараньня забойцаў тав. Варавы

Учора адбыўся агульна-гарадзкі сход працаўнікоў друку гораду Менску, на якім была заслухана інфармацыя тав. Шастакова аб надыходзячым працэсе над забойцай рэдактара насьценгазэты «Зямельны працаўнік» тав. Варавы.

Сход аднагалосна прынятай рэзалюцыі кваліфікуе стрэл Насуты, як тэрарыстычную вылазку разьюшанага кляса ворага, які імкнецца сарваць наша сацыялістычнае наступленьне. Сход патрабуе ад пралетарскага суду жорсткага бязьлітаснага пакараньня забойцы тав. Варавы. Сход далей адзначае, што тав. Варава сьмела пабальшавіцку праз друк выкрываў дзейнасьць клясавых ворагаў, што пралезьлі ў земельны апарат.

За пасьўнае супрацілёўленьне беларусізацыі—

ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ

(Пастанова ячэйкі КП(б)Б Белдзяржвыдавецтва)

Ячэйка КП(б)Б Белдзяржвыдавецтва правяла праверку выкананьня дырэктыў аб беларусізацыі.

Праверка паказала, што ёсьць значныя дасягненьні ў справе беларусізацыі раду ўстаноў, як БДВ, рэдакцыя «Сав. Бел.» ды інш. і зусім нездавальняючае выкананьне дырэктыў аб беларусізацыі ва ўстановах, якія распаўсюджваюць выданьні на расійскай мове (аддзяленьні Дзяржвыдавецтва РСФСР і выдавецтва «Правда»). Бюро ячэйкі ў сувязі з гэтым ухваліла рад канкрэтных і энэргічных мерапрыемстваў, поўнасьцю зацьверджаных сходам партыйнай ячэйкі, які адбыўся гэтымі днямі.

Ва ўхваленай рэзалюцыі адзначана, што кіраўнікі беларускага аддзяленьня Дзяржвыдавецтва РСФСР фармальна аднесьліся да практычнага правядзеньня беларусізацыі. Гэта часамі перагвараліся ў пасьўнае супрацілёўленьне беларусізацыі, у прыватнасьці, з боку членаў КП(б)Б—намесьніка загадчыка аддзяленьня т. Гдалевіча.

Тав. Гдалевічу абвешчана суровая вымова, «бо ён, як член партыі і адзін з кіраўнікоў установы, павінны быў своячасова ажыцьцявіць адпаведныя дырэктывы партыі».

Ячэйка пастанавіла таксама зьвярнуцца ў РК КП(б)Б з прапановай аб вынясьці т. Гдалевіча з кіраўнічай работы.

Зьвернута ўвага нацкамісіі ЦВК БССР на патрэбнасьць ужыць энэргічныя меры ў адносінах кіраўніка (беспартыйнага) аддзяленьня за нэыкананьне законаў ураду аб беларусізацыі ўстаноў.

«Надаючы надзвычайна важнае палітычнае значэньне, гаворыцца ў рэзалюцыі, рашучай і поўнай беларусізацыі ўсіх выдавецтваў і рэдакцый газэт, якія павінны быць прыкладам у гэтых адносінах, і адзначаючы ў справе беларусізацыі рад грунтоўных дасягненьняў, бюро ячэйкі разам з гэтым лічыць неабходным напрадзіць партыйную частку рэдакцый газэт і выдавецтваў аб асобных хібах, якія тэрмінова і рашуча трэба выправіць».

Прапанавана рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» зьвярнуць увагу на паляпшэньне якасьці мовы на старонках самой газэты. Агульны сход зьвярнуў пільную ўвагу на тое, каб супрацоўнікі карысталіся беларускай мовай ня толькі ў сваёй рабоце, але і ў гутарцы і ў быце наогул. У асаблівасьці гэта датычыць супрацоўнікаў газ. «Беларуская Вёска» і «Чырвоная Зьмена». Прапанавана аддзяленьню «Правда» ў месячны тэрмін закончыць работу па канчатковай беларусізацыі ўстановы.

Сход ячэйкі, адзначыўшы, што члены ячэйкі ў цэлым беларускую мову ведаюць і ёю карыстаюцца, зьвярнуў увагу ўсіх членаў ячэйкі на неабходнасьць далейшай беларусізацыі шляхам паляпшэньня якасьці мовы і больш грунтоўнага і сыстэматычнага азнаямленьня з беларускай пралетарскай літаратурай.

В.

Сосіс працягвае абараняць нацыянал-дэмакратычную лінію

(На праверцы ячэйкі падфаку)

Праф. Сосіс, як яўрэйскі нацыянал-дэмакрат, нам ужо вядомы з яго практычнай работы ў яўсеёрны БАН, з яго супрацоўніцтва ў часопісі «Яўрэйская старына», на яго выступленьні на справе Марука (аб чым у свой час пісалі ў «Зьвязьдзе»).

Пры праверцы Сосіса (ячэйка КП(б)В падфаку, Белдзяржуніверсытэту) яшчэ больш выявіўся яго сапраўдны нацыянал-дэмакратычны твар. Ён ні адным словам ня спыніўся на сваіх памылках.

Таварышы, якія выступалі пры праверцы Сосіса, зрабілі поўны аналіз яго твораў, поўнасьцю выкрылі сапраўдную сутнасьць яго поглядаў і г. д. Сосіс у сваіх творах даваў антымарксыцкі нацыяналістычны і ідэалістычны аналіз рэчам і фактарам. У творах Сосіса клясавая барацьба ня існуе. Ён кажа, што: «узмацненьне нацыяналістычных настрояў у яўрэйскім асяродзішчы вынікае з узмацненьня антысэмітызму», не даючы правільнага і поўнага аналізу сацыяльных карэньняў гэтага пытаньня.

Паводле Сосіса выходзіць, што яўрэйскі нацыянал-дэмакратым толькі абараняецца. Гэтым ён хоча прынізіць палітычнае значэньне і патрэбнасьць барацьбы з яўрэйскім шавінізмам, супроць якога партыя, як і супроць шавінізму ўсіх колераў, вядзе самую жорсткую і бязьлітасную барацьбу. А Сосіс у той час, калі партыя рашуча вядзе барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам усіх колераў, прабуе рознымі шляхамі, рознымі фармулёўкамі паслабіць гэтую барацьбу. І таму невыпадковым зьяўляецца яго выступленьне і пры абгаварэньні нацыянал-дэмакратычнай вылазкі Марука.

Невыпадкова і тое, што Сосіс супрацоўнічаў з Раўрэбе. Раўрэбе ў асобе Сосіса спаткаў свайго абаронцу. Невыпадкова таксама і тое, што Сосіс супрацоўнічаў у буржуазнай нацыяналістычнай часопісі «Яўрэйская Старына».

Выступаўшыя таварышы пры праверцы т. Сосіса падалі рад іншых канкрэтных фактаў, якія выразна сьведчаць аб памылковасьці яго поглядаў аб яўным нацыянал-шавіністычным характары яго пазыцыі ў прынцыповых палітычных пытаньнях.

Сосіс, параўнаўшы яўрэйскую гісторыю да рэвалюцыі і пасьля рэвалюцыі заяўляе, што «да рэвалюцыі яўрэйская гісторыя была публіцыстычнай, а пасьля рэвалюцыі яна стала акадэмічнай». Вось вам установа камуністага праф. Сосіса, які сябе лічыць марксыстым. Хіба-ж зараз гісторыя можа разглядацца толькі, як акадэмічная? Відавочна ўся шкоднасьць, увесь буржуазны ідэалістычны характар такой ацэнкі гісторыі, якая (ацэнка) моўчкі абыходзіць клясавую барацьбу, што зьяўляецца галоўным зьместам і асновай асноў гісторыі.

Здаецца, што праф. Сосіс пасьля таго, як выступаўшыя таварышы поўнасьцю выкрылі антымарксыцкую няправільную сутнасьць яго поглядаў, нацыянал-шавіністычны, буржуазны характар яго лініі—ён павінен быў прызнаць памылковасьць сваіх поглядаў. Аднак, гэтага праф. Сосіс не зрабіў. Ён сваіх памылак ня прызнаў.

Такім чынам, Сосіс пасьлядоўна працягвае сваю шавіністычную лінію, упарта абараняе свае погляды, якія рэзка разыходзяцца з лініяй партыі і зьяўляюцца супроцьлегласьцю марксыцкім установкам. Гэта ўсё Сосіс робіць у той час, калі ён зьяўляецца членам камуністычнай партыі, калі ён лічыць сябе камуністым. Партыя выкрывала і будзе да канца выкрываць такіх элемэнтаў, якія фармальна знаходзячыся на пазыцыях партыйнай лініі на справе праводзяць сваю асаблівую лінію, варожую палітычным задачам партыі, якая (лінія) прасякнута буржуазнымі нацыянал-шавіністычнымі ідэйкамі. Такія элемэнты зьяўляюцца нічым іншым, як агентамі нацыянал-дэмакратызму ў радох партыі, што, прыкрываючыся партыйным білетам, упарта праводзяць сваю нацыянал-шавіністычную лінію.

Гэтым элемэнтам партыя заўсёды давала і будзе даваць рэзкі і аднадушны бязьлітасны адпор.

Р—н.

25-га сьнежня—другі дзень індустрыялізацыі

Замест каляд—ударная работа на прадпрыемствах

Агульны сход ДРУКАРНІ І РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА» пастанавіў працаваць у дзень 25-га сьнежня.

Паколькі на 25-га сьнежня прыпадае выхадны дзень, агульны сход парашыў перанесьці выхадны дзень на аўторак 24-га сьнежня; палову заработку за дзень каляд перадаць у фонд індустрыялізацыі; 26-га сьнежня працаваць, як звычайна.

* * *

Агульны сход РАБОЧЫХ ХАРЧАВІКОЎ г. Менску у колькасьці 300 чал. вынес пастанову аб правядзеньні 25-га сьнежня 2-га дня індустрыялізацыі; увесь заработак за гэты дзень паступае ў фонд індустрыялізацыі.

Сход зьвярнуўся да гарсавету з просьбай зьняць званы з усіх цэркваў і касьцёлаў г. Менску і медзь перадаць на патрэбы індустрыялізацыі.

Адначасова рабочыя-харчавікі пастанавілі прасіць гарсавет, паколькі электрастанцыя працуе з празьмернай нагрузкай, выключыць сьвятло з усіх рэлігійных устаноў.

* * *

Агульныя сходы рабочых БРОВАРУ «БЕЛАРУСЬ» І ДРАЖДЖАВОГА ЗАВОДУ «ПРАЛЕТАРЫ» аднагалосна пастанавілі працаваць 25-га сьнежня і заработак аддаць у фонд індустрыялізацыі.

Аб права-апартуністычнай тэорыі і практыцы ўступак

I.

Наша партыя з вялізным посьпехам разгарнула барацьбу ў тэорыі і практыцы супроць правага ухілу і яго ідэолёгаў. Па даным гістарычным этапе партыя зусім правільна падкрэсьліла, што правы ўхіл зьяўляецца галоўнай небясьпекай, што, ня спыняючы барацьбы «на два фронты», партыя згуртоўвае цэнтральны агонь на галоўнай небясьпецы — правым апартуністам і прымірэнцтве да яго Правы ўхіл, у яго тэарытычных канцэпцыях і яго практыцы, зьяўляецца галоўнай небясьпекай таму, што ў пэрыяд, калі наша партыя разгортвае шырокае сацыялістычнае наступленьне на капіталістычныя элемэнты краіны, калі ў абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы ў краіне партыя кіруе ўзмоцненым тэмпам індустрыялізацыі і калектывізацыі, правы ўхіл «цягне па лініі прыстасаваньня да буржуазнай ідэолёгіі па лініі прыстасаваньня нашай палітыкі да густаў і патрэбнасьцяй «савецкай» буржуазіі» (з прамовы т. Сталіна на лістападаўскім пленуме ЦК Усе КП(б) ў 1928 годзе).

Такім чынам, правы ўхіл і яго ідэолёгі (група Бухарына), займаючы пазыцыі прыстасаваньня да буржуазнай ідэолёгіі, цягнуць да развязваньня капіталістычных элемэнтаў у краіне, да фантастычнай рэстаўрацыі капіталізму, да наступленьня перад буржуазна-кулацкімі сіламі Саюзу, якія супрацілёўляцца сацыялістычнаму будаўніцтву.

У барацьбе з правым ухілам, у барацьбе з ідэолёгам гэтага ўхілу — Бухарыным і яго таварышамі — памылкі заволі моцна ўсьвядомілі сабе, адкуль ідзе небясьпека правага ўхілу, адкуль яна вырастае. Надзвычайна добра сказаў на

Арганізацыя ў БССР першых ільнаводных і лубінавых саўгасаў

Плошча ўсіх саўгасаў да вясны павялічваецца на 100 проц.

Сваячасова пачаць падрыхтоўку да сяўбы і разгарнуць ачыстку калгаснага і сялянскага насеньня

Тэрыторыя пад савецкія гаспадаркі Беларусі ў 1929-30 г. павялічана ў параўнаньні з 1928-29 г. **на 50.000 гэкт.**, або на 56 проц. Гэта лічба яшчэ не канчатковая. Саўгаспая плошча расьце. Ёсьць упэўненасьць у тым, што да вясны плошча пад саўгасы павялічыцца на 100 проц.

Намячаецца арганізацыя раду новых буйных саўгасаў. На Бортканавіцкім масыве, Полацкай акругі, арганізуецца **першы на Беларусі ільняны саўгас на плошчы 6.000 гэкт.** На гэтай плошчы мяркуецца вясной 1930 г. **пасеяць 2.000 гэкт. выключна ільном.** Ставіцца пытаньне аб дадатковым водпуску на лініі прамысловасьці 35 трактароў спэцыяльна для гэтай гаспадаркі. Арганізуюцца 4 спэцыяльныя буйныя гаспадаркі па культываньні лубіну—у Мазырскай, Гомельскай, Менскай і Бабруйскай акругах. Усяго па плане будзе **засеяна пад лубін 6.000 гэкт. супроць 500 гэкт. у мінулым годзе.** Плошча пад звычайныя культуры, акрамя арганізацыі новых плошчаў, павялічваецца на 4.400 гэкт.—на 12 проц.

Значна пашыраецца плошча пад ільнянымі культурамі ў старых саўгасах—на 1.277 гэкт.—у 6,5 раз.

Яравыя культуры будуць засяваца на 100 проц. гатунковым насеньнем, а па бульбе—на 85-90 проц., замест леташніх 67 проц.

Пашыраецца плошча пад кораньплодамі з такім разьлікам, каб забясьпечыць кожную галаву буйной жывёлы ў сяроднім **120 пудамі**, замест **55 пудоў у 1929 г.** Павялічваецца плошча засеву сілосным культурамі з тым, каб на галаву рагатай жывёлы прыходзілася ня менш **70 пудоў сілосных кармоў.**

У саўгасах у гэтым годзе арганізуюцца буйныя прамысловыя агароды, **што дасьць магчымасьць забясьпечыць патрэбы гарадоў Беларусі капустай, гуркамі і іншымі гароднымі культурамі на 100 проц., а таксама адправіць у Маскву і Ленінград 250.000 пудоў капусты і да 6 мільёнаў штук гуркоў і іншых агародных культур.** Зараз вядуцца перагаворы з Плодасаюзам на дастаўку гэтых агародных культур у Маскву і Ленінград.

Недахопам агароднай справы зьяўляецца тое, што спажывецкая кааперацыя не праяўляе ініцыятывы. Кааперацыя змагла-б дапамагчы Белсельтрэсту арганізаваць пераапрацоўку гародніны непасрэдна ў саўгасах, **каб даць, напрыклад, капусту спажыўцу ў квашаным стандартным выглядзе, а ня ў сырым выглядзе, як гэта практыкуецца зараз.**

Павялічваецца плошча вікі на насеньне на 62 проц., вікі на сена—на 133 проц., турнэпсу—177 проц., ільну—на 582 проц., пад штучнымі папасамі—на 407 проц. Дзякуючы гэтаму, значна памяншаецца незаняты папар, які будзе складаць у агульнай плошчы 16 проц.

Ураджайнасьць па збожжавых культурах у сяроднім **павялічваецца на 30 проц. Гэта значыць, што падняцьце ўраджайнасьці на 70 проц., якое вызначана па пяцігодцы, будзе выканана ўжо за першыя два гады пяцігодкі на 85.7 проц.**

Падняцьце ўраджайнасьці на 30 проц. можа быць ажыцьцёўлена пры поўным задаваленьні заўкі Белсельтрэсту на штучнае ўгнаеньне. Але ўжо зараз стварылася пагроза ў адносінах забесьпячэньня саўгасаў штучнымі ўгнаеньнямі. Замест 10.000 тон пакуль што цьвёрда задаволена плошча пад культурамі ільну і лубіну. Пытаньне ў адносінах водпуску ўгнаеньня на іншыя культуры ня высьветлена. Такім чынам, каб выканаць задачу па падняцьці ўраджайнасьці, прыдзецца паціскаць, галоўным чынам, на збор попелу, на забесьпячэньне падсьцілачным матар'ялам—саломай і торфам—абораў і хлявоў. Белсельтрэст ужо даў у гэтым напрамку рад паказаньняў саўгасам.

Другой труднасьцю ў правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі і выкананьні намечаных плянаў зьяўляецца недахват у саўгасах цягавай сілы. Белсельтрэст атрымае ўсяго 82 трактары.

Арганізацыя трактарнай справы ў 1929-30 годзе прыме зусім другі выгляд. Калі да гэтага часу трактары былі раскіданы па асобных саўгасах адзінкамі, дык у 1929-30 годзе будзе зроблена рэарганізацыя трактарнай справы ў напрамку стварэньня 6 калён па 10 трактараў, а ў саўгасе імя 10-цігодзьдзя БССР адна калёна ў 46 трактараў, што значна палепшыць эксплёатацыю трактараў, іх рэнтабэльнасьць і пават абслугоўваньне калгасаў.

Машынамі і іншымі прыладамі вытворчасьці саўгасы будуць задаволены поўнасьцю, акрамя прычэпных складаных машын для трактараў, якіх малавата выробляецца ў межах БССР.

Як праводзіцца падрыхтоўка да веснавой кампаніі на мясцох. Калі ў мінулыя гады дырэктыва аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы давалася ў лютым і сакавіку, дык на 1929-30 г. гэта дырэктыва была дана ў верасьні-кастрычніку за 7 месяцаў уперад, каб саўгасы змаглі больш дэтальна і сур'ёзна падрыхтавацца да сяўбы.

У асноўным дырэктыва канкрэтна зводзіцца да наступных паказальнікаў: **абмалот ураджаю павінен быць скончаны не пазьней 15-га сьнежня, абмалот канюшынага насеньня—не пазьней 1-га студзеня, абмалот гатункованага насеньня, а таксама рамонт летняга транспарту і прылад да 1-га лютага.**

З 1-га лютага саўгасы павінны пачаць у сябе пратручваньне насеньня і разгарнуць работу па ачыстцы калгаснага і сялянскага насеньня і правесьці іншыя агранамічныя мерапрыемствы сярод ваколічнага насельніцтва.

Каб гэта дырэктыва была праведзена з найбольшай увязкай з работамі калектывамі. саўгасам прапанавана абгаварыць плян сяўбы на вытворчых камісіях і агульных сходах рабочых, **каб кожны рабочы і работніца саўгасу ведалі аб намечаных мерапрыемствах.**

Для павышэньня кваліфікацыі саўгаскіх рабочых Белсельтрэст разам з саюзам сельгасрабочых праводзіць ва ўсіх саўгасах 3-х-месячныя вытворчыя курсы. На курсы ўцягваюцца так сама калгаснікі і сялянская беднота. **Усяго праз курсы будзе прапушчана каля 1.000 чал.**

Згодна вестак з месц, ва ўсіх саўгасах праходзіць узмоцненым тэмпам малацьба і рамонт інвэнтару. Для праверк выкананьня дырэктыў аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы ў канцы сьнежня на месцы будуць накіраваны адказныя працаўнікі трэсту і інструктары.

М. К.

За ліквідацыю авія-хэмічнай няпісьменнасьці!

VI-ты кангрэс Камуністычнага інтэрнацыяналу пастанавіў растлумачыць рабочай клясе аб тэй падрыхтоўцы да новай сусьветнай вайны, якую вядуць імпэрыялістычныя дзяржавы.

Гэта падрыхтоўка ідзе ўзмоцненым тэмпам і, галоўным чынам, у галіне авіяцыйна-хэмічнай справы.

Кадравы склад польскай арміі, па даных 1928 г., вызначаўся ў 298 тысяч чалавек, прычым агульная колькасьць кадру і запасу складала 58 тысяч афіцэраў і 2 з паловаю мільёны салдат.

За адзін толькі 1928 год пабудавана: Англіяй 32.106 самалётаў і 22.102 маторы, Францыяй—23.669 самалётаў і 44.563 маторы, Італіяй—6.500 самалётаў і 15.000 матораў.

Калі скончылася сусьветная вайна, вялікія дзяржавы рашуча ўзяліся за палепшэньне і пашырэньне сваёй **авіяцыйна-хэмічнай прамысловасьці.** Апошнія 11 год працілі пад знакам удасканаленьня розных сыстэм самалётаў і галоўным чынам бамбардзіровак.

У 1927 г. лік баявых самалётаў, што знаходзяцца ў страі, складаў: ва Францыі—1.650, у Англіі—834, Італіі—600 і ў Польшчы—290.

Зразумела, што гэта колькасьць ня вычэрпвае ўсяго авіяцыйнага рэсурсу гэтых дзяржаў, а зьяўляецца толькі няпоўнай.

Разам з узмацненьнем авіяцыйна-хэмічнай прамысловасьці, імпэрыялістычныя дзяржавы праводзяць вялізарную работу па вялізацыі грамадзянскага насельніцтва.

Для папулярызацыі вайсковае справы імпэрыялістычныя дзяржавы затрачваюць вялізарныя сродкі.

Усё гэта выразна гаворыць аб тым, што імпэрыялістычныя дзяржавы сапраўды рыхтуюцца да вайны гэта ў чаргу абавязкова і нас больш рашуча ўзяцца за справу абароны нашага Саюзу. Трэба памятаць, што ў будучай вайне ня прымуць удзелу толькі дзеці і дарослыя, але і ня ўдзелу толькі дзеці і старыя людзі. А таму ўсе грамадзяне абавязаны быць членамі Таварыства аэраўзыму дзеля таго, каб узмацняць абарону нашага Саюзу і ў першую чаргу індывідуальна сваю авіяцыйна-хэмічную пісьменнасьць.

Ліквідацыя авіяцыйна-хэмічнай няпісьменнасьці палкам залежыць ад актыўнага шырокіх мас працоўных.

Працоўныя Савецкай Беларусі павінны добра вывучыць прынцыпы авіяцыйна-хэмічнай вайны з тым, каб у кожны момант вдолець арганізаваць паветраную абарону. А гэтага можна

Зараз сэкцыя паветрана-хэмічнай абароны Менскага акруговага савету Асоавіяхіму шырока разгарнула сваю работу арганізаваўны больш за 20 гурткоў пры Жактах. адзін хэматрад і 2 курсы падрыхтоўкі кіраўнікоў хэмгурткоў. Але гэтага далёка недастаткова. Трэба дабіцца таго, каб у Менскай акрузе ня было ніводнага Жакту, ніводнага заводу і ўстановы, дзе-б ня было хэмгуртка або каманды

Трэба дабіцца таго, каб кожны член Асоавіяхіму актыўна дапамагаў упягненьню рэшты працоўных у чыны Асоавіяхіму і ў хэмічныя гурткі. **П. Беляеў.**

Да канфэрэнцыі марксыстых-аграрнікаў

Абмяркоўваем зямельны кодэкс

Не надзяляць зямлёй служак рэлігійных культаў

Арт. 14 праекту новага зямельнага кодэксу БССР прадугледжвае, што «асобам, пазбаўленым права выбіраць у саветы, **у тым ліку служкам рэлігійных культаў**, зямля дасцца ў працоўнае карыстаньне толькі па асобнай пастанове раённага выканаўчага камітэту і пры тым у апошнюю чаргу». Такім чынам, хоць і згодна спэцыяльнай пастановы райвыканкому і ў апошнюю чаргу, **аднак у моц** паказанага артыкулу і служка рэлігійнага культу можа быць надзелен зямлёй.

Яшчэ ня так даўно на верасьнёўскім пленуме ЦК КП(б)Б і на старонках друку была падкрэсьлена клясавая нявытрыманасьць абежніка пра зямлякарыстаньне служкаў рэлігійных культаў за 16 студзеня 1925 г. У сучасны момант пункты 1-3 гэтага абежніка, паводле якіх і служкі рэлігійных культаў маглі надзяляцца зямлёй, ужо ня дзейнічаюць, як скасаваныя Прэзыдыумам ЦВК БССР 5-X—1929 г. (Гл. «Савецкую Беларусь» за 10-X 1929 г. № 232).

Між тым, арт. 14 праекту новага зямельнага кодэксу адносна надзяленьня служкаў рэлігійных культаў зямлёй па сутнасьці паўтарае з некаторымі зьменамі тое, што гаварылася ў памянёным вышэй абежніку за 16 студзеня 1929 г.

Я лічу, што пяма ніякіх падстаў надзяляць зямлёй нават у апошнюю чаргу служкаў рэлігійных культаў, бо зямля ў іх зьяўляецца толькі крыніцаю для эксплёатацыі вакольнага насельніцтва, акрамя таго, зямляробства ў іх, зразумела, не зьяўляецца асноўным заняткам. Значыцца, гутарка павінна ісьці не аб **надзяленьні** зямлёй служкаў рэлігійных культаў, а наадварот аб адабраньні ад іх зямлі, што ўжо знаходзіцца ў іх карыстаньні. Дый сам праект новага зямельнага кодэксу ў 23 арт. прытрымліваецца таго погляду, што «не прызнаецца таксама працоўнаю гаспадарка, у якой прыбытак ад непрацоўных заняткаў яе членаў складае асноўную крыніцу іх існаваньня». А значыцца па грунце паказанага 23 арт. падлягае адабраньню зямля ад асоб, у якіх прыбыткі ад непрацоўных заняткаў зьяўляюцца асноўнай крыніцай іх існаваньня, нават і ў тым разе, калі яны зямлю абрабляюць уласнаю працаю. Якія-ж ёсьць падставы для таго, каб паставіць служкаў рэлігійных культаў у нейкае ўпрывілеяванае становішча.

З вышэй нашсанага вынікае, што ў ар. 14 праекту зямельнага кодэксу належыць выкрэсьліць словы «ў тым ліку служкам рэлігійных культаў», а зямлякарыстаньне апошніх павінна рэгуляваца ў адпаведнасьці з 23 праекту.

Д. Гарцман.

Якія папраўкі трэба ўнесьці ў кодэкс*)

Праект новага зямельнага кодэксу зьяўляецца значным дасягненьнем, у параўнаньні з мінулым, які больш-менш адпавядаў адбудоўчаму пэрыяду. Зараз-жа ён ня толькі не садзейнічаў у патрэбнай меры калектывізацыі і барацьбе з кулацтвам, але і не афармляў новага, шырокага руху за рэканструкцыю сельскае гаспадаркі, за суцэльную калектывізацыю.

Новы зямельны кодэкс паўней і лепш выражае сёнешнія задачы ў зямельнай палітыцы партыі, але-ж ва многіх мясцох яго ёсьць яшчэ шмат непасьлядоўнасьці, нерашучасьці. Папершае, як выражаецца асноўная задача зямлеўпарадкаваньня і зямлякарыстаньня. Гл. пар. 6. Тут, папершае, нішэсьменна выказана асноўная задача, зроблен нейкі разрыў паміж задачай разьвіцьця прадукцыйных сіл сельскае гаспадаркі і разьвіцьцём сацыялістычных форм, яны супрацьпастаўляюцца, як быццам, разьвіцьцё прадукцыйных сіл сельскае гаспадаркі можа быць у нас пры дыктатуры пралетарыяту і паміма сацыялістычных форм (калгасаў, саўгасаў), а апошнія, можна думаць, толькі вынік узьдзейнічаньня, надбудовы. Падругое, гэта фармулёўка не адбівае і не афармляе таго сапраўднага рэвалюцыйнага працэсу з спаборніцтвам на суцэльную калектывізацыю, нават акруг, яна западта глядзіць назад, а ня ўперад. Трэба фармуляваць так: «Асноўнай задачай зьяўляецца разьвіцьцё прадукцыйных сіл сельскае гаспадаркі праз сацыялістычныя формы (калгасы, саўгасы) вядзеньня гаспадаркі». Мы гэтым выказваем асноўную, не адзіную задачу і ня выкідваем з поля зроку і індывідуальную гаспадарку, выказваем так, як гэта ёсьць у пастанове верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б.

Кодэкс нерашуча падкрэсьлівае пераважнае права і першачарговасьць на зямлю для калектываў, ён выразна падкрэсьлівае перавагу пры надзяленьні зямлі з запаснога фонду (пар. 38), а ў іншых выпадках няма пасьлядоўнасьці і выразнасьці, ёсьць тая-ж палавіннасьць (гл. пар. 13 і 126). Пар. 126 супярэчыць пар. 121 і занадта клапоціцца аб тых, хто ня ідзе ў калгас, боязьнь пакрыўдзіць.

Зямля дасцца ня былым, а сучасным панам, дасцца былым абшарнікам у іншай акрузе. Што за ўвага і ласка?

Пар. 309, як можна бачыць, дазваляе падаваць заяўкі на хутары. Выходзіць, што хутар і адруб перашкаджае нам толькі тады, калі на ім вырастае кулак, а наогул хутар не перашкаджае, ён не небясьпечны. А дзе-ж падмацняецца ўласьніцкая псыхалёгія, як не на хутары, і чаму хутары больш цяжка перавесьці ў калектыў. Трэба гэты пункт зьмяніць. Можна згадзіцца толькі з прымушанай арганізацыяй хутару, калі напрыклад, трэба выгаравдзіць кулака пры суцэльнай калектывізацыі, а не з заяўкамі. Фармулёўка праекту кодэксу таксама супярэчыць пастанове верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б аб спыненьні нарэзкі хутароў.

Бясспрэчна тое, што неабходна стымуляваць грамадзкую апрацоўку зямлі, але-ж трэба прадугледжваць і магчымую кулацкую афарбоўку пад гэтым. Пар. 133, вдаецца, можа быць выкарыстан заможнымі і кулакамі, калі яшчэ не паказаць мінімум двароў для арганізацыі і спосабы разьмеркаваньня прадуктаў.

Аб арэндзе зямлі і найме рабочай сілы. Пар. 236 забараняе як здавацъ, так і брацъ у арэнду зямлю кулацкім гаспадаркам, а пар. 262 проста легалізуе праз наём рабочае сілы для арандаванай зямлі і арэнду самой зямлі. Ці заможная, або кулацкая гаспадарка ня можа спачатку на законе заарандаваць зямлю, ня будучы фармальна спачатку кулацкай, а потым наняць батракоў. Такі шлях магчымы. Потым нідзе не падкрэсьлена абавязковасьць дагавору на арэнду зямлі і яго рэгістрацыі. Хоць-бы пар. 244, ён кажа толькі, што дагавор **можа** быць зроблены, а не павінен. Таксама не гаворыцца аб абавязковай рэгістрацыі і наёмнай працы (пар. 257). Чаму гэта ўжо зараз нельга катэгарычна паставіць у закон аб гэтым больш выразна.

Яшчэ аб арэндзе зямлі. Зусім зразумела, што здаваць у арэнду дазваляецца для аслабленых навальнымі бядотамі, недахопам інвэнтару і стратай рабочай сілы. Сюды, здаецца, увайшлі ўсе ўважлівыя прычыны. Але дапускаць (пар. 235) арэнду для часова (які яшчэ час) адыходзячых на працоўныя заработкі, калі мы клапоцімся аб павышэньні прадукцыйнасьці сельскае гаспадаркі, аб зьмяншэньні наплыву з вёскі беспрацоўных — зусім нямэтазгодна. Тым больш, што такая арэнда яна зьяўляецца непрацоўным даходам для таго, хто здае і некалькі вачапляе нацыяналізацыю. Пры гэтым прыходзіцца ўлічваць, што той, каму патрэбна найсьці на 2-3-месячныя заработкі, можа і сам апрацоўваць зямлю. Трэба выкінуць дазвол арэнды для адыходзячых зусім.

Аб калектывах. Разьдзел аб калектывах, як і патрэбна было, значна папраны і ўключае ў сябе амаль усё неабходнае. Аб пераважнасьці на зямлю для калектываў гаварылася раней, гаварылася аб нявыразнасьці яе. Зараз можна выказацца аб пімногім. Пры арганізацыі зямлякарыстаньня для калектываў па кодэксе трэба было-б забараніць (пар. 115) агрыманьне зямлі выходзячымі адзінкамі з калектываў (камуна, арцель), зусім незалежна ад статуту, і гэта, бадай, хутчэй можа быць ажыцьцёўлена, чымся на пар. 114 забарона дзяльбы цры распадзе.

Незразумела, чым выклікаецца мэтазгоднасьць і карыснасьць у дазволе калектыву (пар. 87) мець зямлю сумесна з грамадой у паасобных палетках. Хутчэй ад гэтага будзе шкода. Далей, калі не дазваляецца членам камуны і арцелі мець па-за калгасам зямлю ў індывідуальным карыстаньні (пар. 91), можна забараніць мець і гаспадарчую маемасьць, аслабаніць, аблегчыць члена ад такой загрузкі дзьвёх гаспадарак, падвойнага інтарэсу і страхоўкі да распаду. Кажучы аб ільготах, трэба даць больш пераважнасьцяй і льгот, хто хутчэй пераходзіць да поўнага арганізаваньня і павялічваць непадзельны капітал (пар. 67). У калектывах ня рэдкі выпадкі, калі прыходзіцца выключаць асобных членаў за розныя рэчы і пры гэтым сустракаюцца труднасьці, асабліва калі ёсьць сваяцкія групы. Магчыма, што лепш было-б (пар. 101) зьменшыць кворум да простай большасьці прысутных для пастаноў па гэтым пытаньні.

У агульным можна сказаць, што новы зямельны кодэкс дапаможа на гэтым этапе прысьпяшыць сацыялістычную і тэхнічную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі. Да яго яшчэ трэба было-б дадаць палянішэньні ў лясным зямляўпарадкаваньні, мерапрыемствы супроць зьнішчэньня лясоў, выгад кулакоў, абавязаць грамаду займацца дрэванасаджэньнем і тады можна было-б яшчэ больш дабіцца посьпехаў.

П. МЯДЗЬВЕДЗКІ.

*) Артыкул друкуецца ў парадку абмеркаваньня. З паасобнымі палажэньнямі аўтара рэдакцыя нязгодна.

Падкісана 10 генэральных калдагавароў

Па радзе саюзаў кампанія ў асноўным скончана

Па саюзе хэмікаў калдагаворная кампанія ў асноўным закончана. Калдагавор з запалкавым трэстам падпісаны. Дасягнута згода з Шклотрэстам. Генэральны дагавор будзе падпісаны сёньня-заўтра. Гендагавор з запалкавым трэстам заключаны без канфлікта. з Шклотрэстам быў адзін канфлікт па некалькіх пытаньнях, якія вырашаны на карысьць рабочых.

Харчавікі падпісалі ген. дагавор з Цэнтрасьпіртам, падпісаны таксама дагавор з бойняю. Дасягнута згода з Белдзяржсьпіртам. Некалькі зацягнуцца перагаворы з Белхарчтрэстам і Кішпрамгандлем. Белхарчтрэст да гэтага часу не паведаміў Белкамітэту саюзу харчавікоў свае думкі адносна праекту дагавору.

Дрэнна стаіць справа ў мэтапістых. Ня скончаны перагаворы з адміністрацыяй заводу «Камунар» — будзе канфлікт. Па заводзе «Энэргія» яшчэ працягваецца абгаварэньне праекту дагавору. на «Эльводзе» таксама. Дасягнуты згоды толькі па радзе дробных менскіх прадпрыемстваў. На Віцебску толькі цяпер пачаты перагаворы з гаспадарнікамі. У Гомелі ў самым разгары нулі на іншую работу старшыню акрадкаллагаворнае кампаніі раптам перакінулі на іншую работу старшыню акрадзяленьня саюзу мэталістых тав. Пажывалка. У Гомель выехаў старшыня Белкамітэту саюзу мэталістых тав. Іваноў. З Магілеву і Бабруйску вестак няма.

Па саюзе друкароў падпісаны дагавары з адміністрацыяй шпалернае фабрыкі і працкалектыву «Паліграф». Учора ЦП саюзу інфармавала рабочых Белдзяржвыдавецтва аб ходзе перагавораў. Што-ж датычць рэдакцый газэт («Работчий», «Сав. Беларусь». «Беларуская Вёска». «Акцябр» і «Чырвоная Зьмена»), якія ад усіх патрабуюць хутчэйшага заключэньня дагавораў, дык яны нават яшчэ не абгаварылі на агульных сходах праектаў новых дагавароў. Белбюро сэкцыі працаўнікоў друку аб гэтым ведае. але нічога не прадпрымае.

Гарбары падпісалі генэральны дагавор з Белшкуртрэстам, дасягнута згода з Белшчаціной — дагавор будзе падпісаны праз 2 дні. Дасягнута згода з адміністрацыяй шчотачнай фабрыкі. Ні па адным дагавары ня было канфліктаў. 60 проц. прапаноў рабочых уключаны ў дагавары.

Па саюзе нархарч дасягнута згода з МЦРК на рабочых сталовых і буфэтаў, а абслугоўваючым трэстам на рабочых гасьцініц, а таксама з транспартным трэстам на рабочых трамваю, з аддзелам ачысткі і з абслугоўваючым трэстам. Усе дагавары будуць падпісаны гэтымі днямі.

Па саюзе працаўнікоў папяровае прамысловасьці ўжо падпісаны генэральны дагавор з Белпантрэстам. Яшчэ неабгаворан дагавор на служачых самога Белпантрэсту.

ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў падпісала калдагаворы з адміністрацыяй ф-кі «Беларуска», фабрыкі «Адраджэньне», а таксама інстытуту дзяржаўнага ляснога бракэражу. Генэральны дагавор з Лесбелам на мясцох ужо абгавораны. Сёньня адбудзецца ўсебеларуская нарада прадстаўнікоў прадпрыемстваў і гаспадарнікаў. Ёсьць тры спрэчныя пункты.

Камунальнікі падпісалі дагавары з адміністрацыяй пажарнае каманды па рабочых трубатраду, а таксама 6 дагавароў з жактамі. Дасягнута згода з акрвыканкомам на рабочых пажарнае каманды, з транспартным трэстам на рабочых трамваю, з аддзелам ачысткі і з абслугоўваючым трэстам. Усе дагавары будуць падпісаны гэтымі днямі.

Кулак імкнецца пралезьці ў калгас,

каб разбурыць яго з сярэдзіны

... „Усиленими мерами перешкоджаючы і перасякаючы спробы кулацтва пралезьці ў калгасы, партыя павінна ўпартай і сыстэматычнай работай забясьпечыць згуртаваньне батрацка-бядняцкага ядра ў калгасах“

(З рэзалюцыі лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б).

(Ад нашага аршанскага карэспандэнта)

Калектывізацыя на Аршаншчыне ідзе шпаркім крокам наперад. Зараз ужо існуе 293 калгасы на плошчы звыш 113 тыс. гэкт. зямлі, што складае 14 проц усёй пахаці па акрузе. Некаторыя раёны, як напрыклад, Ляднянскі, ужо цалкам калектывізаваны. Тут арганізуецца аграіндустрыяльны калгас на плошчы ў 67 тыс. гэкт. У Круглянскім раёне арганізавана 8 вялікіх калгасаў.

Паводле плянавых меркаваньняў, у 1930 годзе будзе праведзена калектывізацыя на плошчы ў 38.000 гэкт.

Акруговая канфэрэнцыя беднаты прыняла пастанову аб тым, каб на працягу бліжэйшых 3-х год правесьці поўную калектывізацыю акругі.

З такім вялізарным уздымам бядняцка-серадняцкіх мас наўкола пытаньня аб калектывізацыі, з такім шырокім і шпаркім тэмпам калгаснага будаўніцтва ніяк ня можа прымірыцца кулацтва. Яно ўсялякімі спосабамі стараецца пашкодзіць калгаснаму руху на вёсцы. Яно імкнецца ўзьдзейнічаць на беднату шляхам агітацыі і пашырэньнем розных хлусьлівых чутак. Асабліва кулацтва, стараецца ўзяць над свой уплыў сялянак. Кулак імкнецца сам пралезьці ў калгасы, каб потым там ужо з сярэдзіны разбурваць іх працу, скампрамэтаваць калгасы у вачох сялянства і паказаць, што ісьці ў калгасы ня варта.

Вось некалькі прыкладаў, якія сьведчаць аб усёй тэй шкодная працы, якую праводзіць кулацтва з мэтаю барацьбы з калгасным рухам.

У в. Зубры, Руткаўскага сельсавету, арганізуецца калгас. Кулакі адразу-ж заварушыліся. Яны нагаворваюць сялянкам, што ў калгасе дзеці будуць галодныя, што ім не дадуць малака, што наогул паёк там будуць атрымліваць толькі дарослыя, а дзецям ніякіх прадуктаў адпускацца ня будзе. Гэта робіць некаторы ўплыў на больш адсталых і несьвядомых сялянак. Ня ведаючы таго, што ў калгасах дзецям будзе куды лепш жыцца, чым у індывідуальных гаспадарках, што за імі там будуць лепш даглядаць, чым цяпер, паасобныя сялянкі, запалоханыя кулакамі, адмаўляюцца ісьці ў калгасы і адгаворваюць мужчын.

У зьвязку з правакацыйнымі чуткамі кулакоў у сельсаветах Дубровенскага і Ляднянскага раёнаў, дзе праводзіцца суцэльная калектывізацыя, нагледаўся звышнармальны продаж жывёлы больш заможнымі гаспадарамі. **Збываюць сваю жывёлу і распродваюць усю маемасьць і кулакі. Гэта яны робяць для таго, каб, стаўшы беднякамі, працерабіць сабе дарогу ў калгасы і там займацца шкодніцтвам.**

Адзін з кулакоў так і заявіў:

— Я распрадам усю сваю маемасьць, каб на вясну зрабіцца бедняком і каб мне ўсё давалі або прынялі ў калгас, а там я буду жыць, як мне захочацца.

У пядаўна арганізаваную вялікую с.-г. камуну (Печкаўскі сельсавет) трапіла некалькі кулакоў. Яны адразу пачалі займацца шкодніцтвам і разьвальваць гэту камуну. Толькі пасьля выключэньня кулакоў праца ў камуне пайшла нармальным парадкам.

У некаторыя калгасы Амсьціслаўскага раёну таксама пралезьлі кулакі. Яны выступалі супроць кантрактацыі і здачы дзяржаве хлебных ліпшкаў.

Улічваючы ўсе гэтыя акалічнасьці, **канфэрэнцыя беднаты патрэбавала, каб кулакоў ня пускалі ў калгасы. Акругком партыі даў дырэктыву правесьці ачыстку калгасаў ад кулацкага элемэнту.**

Лепшыя калгасы акругі пад кіраўніцтвам вытрыманых таварышоў зьяўляюцца добрымі агітатарамі за калектывізацыю і, такім чынам, даюць адпор кулацтву. Так, напрыклад, с.-г. камуна «Х Кастрычнік», Аршанскага раёну, перайшла на грамадзкае харчаваньне. Гледзячы на гэта, усе іншыя вёскі Аршанскага раёну, якія ўступаюць у калгасы, ставяць у першую чаргу пытаньне аб пераходзе на грамадзкае харчаваньне.

Такім чынам, ня гледзячы на кулацкую хлусьню, на ўсе кулацкія махінацыі, беднота і сераднякі сьмела ідуць у калгасы і даюць рашучы адпор кулацтву.

Бязумоўна, у далейшай працы па калектывізацыі, на вёсцы патрэбна самая шырокая дапамога з боку рабочых брыгад. Трэба таксама прыняць шэфства над новымі калгасамі. Усе гэтыя мерапрыемствы палепшаць пастаноўку працы ў калгасах і адаб'юць ахвоту ў кулакоў распускаць іржывыя чуткі супроць калгасаў.

А. МІЛАШЭЎСКІ.

ЗАЯВА ТАВ. ГЭЛЬТМАНА*)

Памылкі, якія я зрабіў, патрабуюць бальшавіцкай крытыкі. З прычыны падрыхтоўкі адпаведнай вялізарнай працы, заканчэньня якое перашкаджалі вялікая колькасьць службовых абавязкаў і доўгатэрміновыя выезды на вёску, цяпер я падаю кароткую адзначаную ніжэй заяву.

Сутнасьць маіх памылак заключаецца ў тым, што пры наяўнасьці нацыяналістычных тэндэнцый сярод працоўных польскіх мас—з аднаго боку, і недаацэнкі значэньня нацыянальнага пытаньня—з другога, не патрапіў у поўных момантах утрымацца на адзіна пра вільнай ленінскай лініі, з прычыны чаго і зрабіў памылкі, якія аб'ектыўна маюць апартуністычны характар у нацыянальных пытаньнях.

Асабліва мае памылкі праявіліся ў трох выпадках: 1) справа палітычнае ацэнкі фізыяноміі А. Міцкевіча. Спрашчэньне, якое я ўжыў у артыкуле, прызначаным для дзіцячых кніжок, аб А. Міцкевічу, і якое грунтуецца на адпабаковай ацэнцы, ідэалізуючай палітычную фізыяномію Міцкевіча, было памылкаю, якая сьведчыць аб недастатковай чульлівасьці ў адносінах нацыянальнапытаньне небясьпекі **) 2) Справа кніжкі «1863 год у Меншчыне. Матар'ялы архіву аддзелу III-га былое царскае канцылярыі», якая была 1-аю кніжкаю 1-га т. вялізарнага выданьня дакумантаў.

Памылка мая заключалася ў тым, што як кіраўнік установы, якая выдала кніжку, дапусьціў яе выданьне з неадпаведнаю, немарксыцкаю прадмоваю, не прадбачыўшы небясьпекі ў выданьні гэтага зборніку, без адпаведнага марксыцкага асьвятленьня тых пытаньняў, да якіх гэтыя дакументы адносяцца, г. зн. без адпаведнае прадмовы і камэнтараў, што, асабліва пры даным укладзе матар'ялаў, аб'ектыўна магло дапамагчы ўзрастаньню нацыяналістычных тэндэнцый сярод працоўнага польскага насельніцтва на Беларусі.

3) Справа маёй кніжкі «Работнік польскі ў Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі».

— Даў неадпаведны аналіз і небальшавіцкую ацэнку апісаных здарэньняў. Дзякуючы гэтаму мая кніжка, зьяўляючыся зборнікам фактаў, у паасобных выпадках уводзіць чытача ў заблужэньне.

— Як актыўны ўдзельнік апісаных здарэньняў, я быў падвойна абавязаны даць гэтую ацэнку ў поўным яе значэньні, паддаючы крытыцы таксама і свае тагачасныя памылкі.

Другою прынцыповаю памылкаю маёй кніжкі зьяўляецца тое, што я ня даў крытычнага асьвятленьня мінулага польскага рэвалюцыйнага руху і польскіх рабочых партый. Кароткая іх характарыстыка надавычай павярхоўная і агульная і не дае ацэнкі прынцыповых пытаньняў. Гэта памылка мае апартуністычны характар, бо ў аснову не было пакладзена жаданьне ўнікнуць у той час (1927) пытаньняў, якія вымагаюць крытычнага асьвятленьня і ацэнкі, г. зн., адсутнасьць адвагі па ўзьняцьці грамадзкае самакрытыкі мінулага рэвалюцыйнага руху.

Акрамя таго, у маёй кніжцы знаходзяцца паасобныя няпэўныя або памылковыя фармуляваньні.

— Яшчэ раз поўнасьцю прызнаю свае памылкі. адхіляю абвінавачаньне мяне ў шумскізьме і ў «імкненьні да новага (? С. Г.) аб'яднаньня з агентамі Пілсудзкага і рад іншых абвінавачаньняў, якімі т. Варскі ў сваіх артыкулах, зьмешчаных у «Трыбуне Радзецкай» і «Мысьлі Бальшавіцкай», а потым перадрукаваных у зборніку «На фронце ідэалёгічным», закідае мяне. падманоўваючы сябе пры гэтым фальшывымі, перакручанымі або перайначанымі пытаньмі і фальшыва асьвятляючы факты.

— Адначасова прымушаны падчыркнуць, што становішча тав. Варскага затрудняла мне зразумець сутнасьць і характар маіх памылак, а партыйным масам затрудняла навучэньне на іх

*) Заява надрукавана ў газэце «Трыбуна Радзецка».

**) Адзначаю, што гэты артыкульчык ня быў надрукаваны і што на агульна-саюзнай нарадзе супрацоўнікаў польскіх бюро ў маі 1928 г. прызнаў публічна гэта правільным. адзначаючы пры гэтым, што лічу яго памылковым. з памылковымі сфармуляваньнямі і што яго не падтрымліваю.

Таксама адзначаю, што характарыстыку палітычнае фізыяноміі А. Міцкевіча, якая хаця і няпоўная, але ўсё-ж ня можа выклікаць сумненьня ў адносінах

ЧАМУ ЗАГІНУЎ РАБКОР БАГАЙСКІ

Абсьледаваньне прычын самагубства рэдактара насьценгазэты ф-кі «Спартак» т. Багайскага, праведзенае ЦК саюзу рабочых папяровай прамысловасьці СССР, выявіла, што на фабрыцы панавала самая сьцэ і цэхаўшчына, што фабрычныя арганізацыі плавіліся ў хвасьце адсталых груп, што зусім ня была разгорнута самакрытыка. Нездаровая атмасфэра на фабрыцы давяла зацкаванага рабкора да самагубства. Зараз прынятыя рад мер да аздараўленьня работы на фабрыцы

Газэта «Зьвязда» ў свой час падрабязна паведаміла аб прычыне самагубства рэдактара насьценгазэты папяровай фабрыкі «Спартак» Багайскага і аб вывадах па гэтай справе Магілеўскага акругкому і АКК КП(б)Б.

Зараз прадстаўнік ЦК саюзу рабочых папяровай прамысловасьці СССР тав. Батнеў скончыў абсьледваньне работы на фабрыцы і паведаміў нашаму супрацоўніку рад цікавых даных аб тэй абстаноўцы

МЕНСК

Новы народны камісар унутраных спраў і старшыня ДПУ Бел.

У зьвязку з пераходам т. Піляра на іншую работу, прэзыдыум ЦВК БССР назначыў народным камісарам унутраных спраў і старшынёю ДПУ Беларусі т. Г. Я. Рапапорта.

100.000 р. на культурна-бытавыя ўстановы пры калгасах

Бытавая камісія пры ЦВК БССР адпусьціла 50.000 руб. на арганізацыю ў калгасах камбінаваных ясьляй-дзіцячых садоў. Усяго будзе адкрыта на гэтыя сродкі каля 50 дзіцячых устаноў.

Апрача таго 50.000 руб. на культурна-бытавыя ўстановы пры калгасах будуць адпушчаны акруговымі бытавымі камісіямі. Усе гэтыя сродкі адпускаюцца звыш бюджэтных асыгнаваньняў.

Стралковы спорт узімку

Праведзенае за апошні час стралковае спаборніцтва сярод членаў камсамолу паказала, што стралковая справа пастаўлена ў нас не на належную вышыню.

У часе зімовай вучобы камсамольскія арганізацыі павінны зьвярнуць увагу на папыраньне стралковага спорту сярод членаў ЛКСМ і рабочай моладзі. Стралковы спорт павінен праходзіць сыстэматычна.

Пашыраецца менскі вячэрні тэхнікум

Калегія НКА пастанавіла адкрыць пры Менскім вячэрнім рабочым тэхнікуме мэханічнае аддзяленьне па апрацоўцы мэталю.

На гэтае аддзяленьне будуць прымацца толькі рабочыя мэханічнай вытворчасьці (мэталісты, чыгуначнікі і г. д.) з кваліфікацыяй ня ніжэй 3-га разраду новай тарыфнай сеткі. Прыём заяў працягнуты да 24-га сьнежня. Іспыты адбудуцца ад 26-га сьнежня да 1-га студзеня.

Абсьледваньне рабочага забесьпячэньня на транспарце

Прэзыдыум Белбюро ЦК чыгуначнікаў адзначыў, што дырэктыва аб забесьпячэньні рабочых-чыгуначнікаў ня выканана; савет транспартнай каапэрацыі дрэнна кіруе працай. Пастаноўлена аб усіх гэтых ненармальных фактах давесьці да ведама ЦК саюзу і транспасэкцыі. Вылучана спэцыяльная камісія для абсьледваньня працы па рабочым забесьпячэньні на транспарце.

Усебеларускі зьезд па жывёлагадоўлі

27-га студзеня склікаецца ўсебеларускі зьезд па жывёлагадоўлі. На зьезьдзе будуць заслуханы даклады: т. РАЧЫЦКАГА — аб чарговых задачах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, ТАКМАЧОВА і ЖУРЫКА— аб шляхох разьвіцьця жывёлагадоўлі, інж. МАЦЯРЫХІНА аб пераапрацоўцы прадуктаў жывёлагадоўлі і г. д.

На зьезд прыбудзе 190 дэлегатаў ад акрэг, малочных саюзаў, саўгасаў, калгасаў і навукова-дасьледчых інстытутаў.

Хроніка Белдзяржкіно

— Рэжысэр Тарыч закончыў натурныя здымкі карціны «Чорная кроў» у Баку і Грозным. Пастановчы калектыў вярнуўся ў Ленінград для павільённых здымкаў на фабрыцы. Фільма малюе ўплыў францускага капіталу на польскую прамысловасьць і здрадніцтва ППС.

— Рэжысэр Корш мантыруе карціну «Волат», якая адлюстроўвае Беларусь у глыбокім мінулым і Беларусь, якая вызвалена Кастрычніцкай рэвалюцыяй.

— Пастановчы калектыў рэжысэра Дзігана ў хуткім часе прыступае да здымкаў мастацкай карціны аб антысэмітызьме.

— У Галоўрэпэртком БССР прадстаўлены наступныя новыя сцэнары: «Лясныя браты»—Леанідава—на тэму аб рэвалюцыйным руху ў Латвіі ў 1905 г., «Зачынена ўначы»—на тэму аб ліпеньскім паўстаньні 1917 г., «Вучэнцы адпачываць»—сцэнары культфільму Рафаловіча і інш.

— Кіно-хроніка Белдзяржкіно рэарганізуецца ў штомесячную часопісь, якая будзе адлюстроўваць усё жыцьцё БССР. Ва ўсіх акругах будуць спэцыяльныя кіно-карэспандэнты.

ПАПРАЎКА

У артыкуле «Рэчыцкія правалы («Зьвязда» № 280) у часе вёрсткі скарочаны абзац аб вытворчых паказальніках, у сувязі з чым паказальнікі даны толькі па «Кастрычніку».

Сапраўдная становішча на прадпрыемстве такое:

Па «Дняпры» вытворчая праграма выканана на 112,65 проц. (праўда, за лік павялічэньня рабочай сілы), сабекошт зьніжаны на 1 проц., замест 7.

Па «Кастрычніку» вытворчая праграма выканана на 69,65 проц., зьніжан сабекошт на 19 проц., замест 24 проц.

Па фанэрным заводзе вытворчая праграма—105 проц., сабекошт—3,5 проц., замест 7.

Брак павялічыўся з 6,14 у ліпені да 7,25 проц. у верасьні.

Наогул запраектаваныя заданьні па зьніжэньні сабекошту на 7 проц. і падняцьці прадукцыйнасьці працы па 17 проц.—**па ўсім прадпрыемстве ня выкананы.**

СУД

За забойства селькора—р. сэтрэ

Уначы 5-га верасьня гэтага году ў вёсцы Васілеўшчыне, Самахвалазіцкага раёну, у часе пажару на валох сялянства кулак Антон Будай зякераю на галаве забіў аднавяскоўца Даніла Фалько. Забіты Фалько—бядняк, быў актыўным вясковым работнікам, прымаў актыўны ўдзел у правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў савецкай улады на вёсцы. Фалько асабліва актыўна ўдзельнічаў у зямляўпарадкаваньні Чэркаскай дачы. Апрача таго, тав. Фалько зьяўляўся селькорам газэты «Беларуская Вёска».

Такая актыўнасьць тав. Фалько выклікала абурэньне кулацкай часткі вёскі, асабліва ненавідзеў забітага Будай. Апошні фіктыўна разьвёўся са сваёю жонкаю, каб не ляпусьць абрэзкі сваёй гаспадаркі. Фалько выкрыў махінацыі кулака Будая. Частка зямлі ад яго была перадана ў зямельны фонд. З гэтага моманту кулак Будай шукаў зручнага вынадку, каб адпомсьціцца за свае крыўды селькору Фалько. 5-га верасьня ён свой злы намер выканаў і забіў тав. Фалько.

Менскі акруговы суд прыгаворыў кулака Будая да расстрэлу. Апрача таго прысуджна спаганяць з гаспадаркі Будая па 50 рублёў у месяц у карысьць дзяцей забітага Фалько.

А.

ТОЛЬКІ

У ГАЗЭТНЫМ БЮРО
Ленінская вул., 34 (ПОШТА)
МОЖНА ВЫПІСАЦЬ ЛЮБУЮ ГАЗЭТУ АБО ЧАСОПІСЬ СССР на 1930 год.

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА 1930 ГОД

на старэйшую ў БССР вялікую штодзенную газэту

ЗЬВЯЗДА

ЦЭНТРАЛЬНЫ ОРГАН КП(б)Б. XIV ГОД ВЫДАНЬНЯ.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

	12 мес.	6 мес.	3 мес.	1 мес.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА	9 р. 75 к.	5 р. — к.	2 р. 60 к.	— р. 90 к.

„ЗЬВЯЗДА" дае сваім падпісчыкам дадаткамі на ільготных умовах наступныя часопісі:

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ — ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на 1 м.—20 к. (замест 35 к.)

ЧЫРВОНАЯ БЁЛАРУСЬ — Падпісчыкі «ЗЬВЯЗДЫ» будуць атрымліваць гэту часопісь на ільготных умовах.

ОГОНЕК — ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на «ЗЬВЯЗДУ» з часопісьсю «ОГОНЕК» на 1 м.—1 р. 10 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: галоўнай канторай «ЗЬВЯЗДЫ» (Менск, Савецкая, 63), усімі паштовымі канторамі, лістаносцамі і спэцыяльнымі ўпоўнаважанымі.

Дзе будаваць агра-індустрыяльны камбінат?

(У парадку абгаварэньня)

Пытаньне аб пабудове агра-індустрыяльнага камбінату на Аршаншчыне ў сучасны момант мае вялікае значэньне. Вельмі важна пэпер-жа вырашыць, дзе тэрытарыяльна павінен будавацца камбінат, каб мець мажлівасьць разьлічваць на лепшую пастаноўку працы ў ім.

Па пастанове плянуючых органаў Беларусі (Дзяржпляну) і Аршанскай акруговай плянавай камісіі агра-індустрыяльны камбінат павінен будзе будавацца на тэрыторыі Ляднянскага раёну, у якім, па думцы гэтых устаноў, сельская гаспадарка мае ў сучасны момант ільняны напрамак (культура ільну займае 11 проц. усёй пасеўнай плошчы). Наяўнасьць шпаркага тэмпу калектывізацыі дае магчымасьць вырашыць гэта пытаньне станоўча для Ляднянскага раёну.

Гэтаму пытаньню значны час і энэргію ўдзялілі навуковыя працаўнікі і студэнты Бел. с.-г. акадэміі.

Пры гэтым выявілася, што Горацкі раён па сваіх натуральна-гістарычных глебавых і эканамічных умовах спрыяе таму, каб пабудаваць на яго тэрыторыі агра-індустрыяльную гаспадарку з ільняна-малочным напрамкам. Нарада спэцыялістых акадэміі дае на гэта ясны аказ: «Усе абэктыўныя ўмовы Горацкага раёну даюць мажлівасьць разьвіцьцю жывёлагадоўчага (малочна-бэконнага), ільнянога і садовага напрамку гаспадаркі, на базе якога магчыма арганізацыя камбінату па пераапрацоўцы малака, ільну і садавіны.

Культура ільну па 11 сельсаветах, паводле папярэдніх даных, складае ў сярэднім каля 7 проц. усёй пасеўнай плошчы, у некаторых-жа сельсаветах даходзіць да 9 проц. Такім чынам, лён у сельскай гаспадарцы раёну зьяўляецца ня толькі спажывецкай але і таварнай культурай, пры тым мае тэндэнцыю з кожным годам пашырацца. Разьвіцьцё жывёлагадоўлі ў Горацкім раёне—факт бясспрэчны.

Пры пабудове агра-індустрыяльнага камбінату галоўную ролю павінны адыграць ня толькі паказальнікі вытворчасьці сёнешняга дня, а сума паказальнікаў аб'ектыўных умоў ва ўсім сваім разрэзе, у прыватнасьці пытаньні забесьпячэньня неабходным лікам высокакваліфікаваных спэцыялістых, пытаньне падрыхтоўкі належных кадраў спэцыялістых для абслугоўваньня аграмаджанай сельскай гаспадаркі.

Гэтыя моманты павінны быць поўнасьцю ўзяты пад увагу пры вырашэньні пытаньня, дзе будаваць агра-індустрыяльны камбінат.

Трэба таксама ўлічыць наяўнасьць на тэрыторыі Горацкага раёну с.-г. акадэміі, якая павінна мець вакол сябе буйную агра-індустрыяльную гаспадарку, якая-б зьявілася жывым выхавальнікам адпаведных кадраў. На бліжэйшы час гэты тып гаспадаркі акадэмія зможа атрымаць толькі пры ўмоце, калі агра-індустрыяльны камбінат, які праектуецца будаваць на тэрыторыі зямель Ляднянскага раёну, будзе ахапляць і землі Горацкага раёну.

Пры такой умове правільна будзе вырашана пастаўленая праблема аб скарыстаньні з максымальнай эфэктыўнасьцю навуковых працаўнікоў, студэнтаў і дасьледчыя ўстановы акадэміі.

Капітальныя ўкладаньні, якія неабходна будзе акадэміі патрацiць на пабудову дапаможных устаноў (ільняна-тэхнічнага і алейнага заводаў, машынна-трактарнай станцыі і цэлага раду іншых), ня будуць патрэбны пры пабудове агра-індустрыяльнага камбінату і ў Горацкім раёне.

Калектывізацыя насельніцтва ў Горацкім раёне ідзе шпаркім тэмпам; ёсьць сельсаветы, якія калектывізаваны поўнасьцю і да вясны 1930 году пастанова акругкому аб суцэльнай калектывізацыі Горацкага раёну. пры максымальных затратах сіл і сродкаў павінна быць акадэміяй выканана.

Высунутае пытаньне падлягае шырокаму грамадзкаму абгаварэньню і канчатковаму яго вырашэньню.

ПУЦЯЖО.

ЗДАРЭНЬНІ

Зладзеі-«кішэньнікі». Затрыманы зладзеі Дзімітрачэнка, Магілеўскі, Рубін і Арон, якія займаліся пакражаю грошай з кішэнь. Усе гэтыя зладзеі-«кішэньнікі» аддаюцца пад суд.

РАБОЧЫМ ГУТЫ „ПРАЛЕТАРЫ" НЕДЗЕ ПРАВАДЗІЦЬ КУЛЬТРАБОТУ

На Менскай гуце «Пралетары» працуе 350 рабочых, але завод ня мае дзе разгарнуць культурна-масавай работы. Улетку работа праводзіцца ў садзе, а зімою няма нават дзе сходу наладзіць. Летась, у часе самых вялікіх марозаў рабочыя прымушаны былі арганізоўваць свае сходы на заводзкім дварэ.

Ня гледзячы на тое, што партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі заводу ўжо некалькі месяцаў назад прасілі Менскі гаркамгас перадаць пад клюб заводу невялічкі драўляны дом, які знаходзіцца на тэрыторыі заводу, камгас да апошняга часу гэтага пытаньня станоўча ня вырашыў.

Нават пасьля таго, як гэты дом быў муніцыпалізаваны ў былога ўласьніка яго, кулака Юрэвіча, спрага ніколькі не пасунулася наперад. Менскі гаркамгас ня прымае ніякіх мер для высяленьня з гэтага будынку прыватных жыхароў.

Між тым, ёсьць адпаведныя пастановы партыйных і прафэсыянальных арганізацый за перадачы гэтага дому пад клюб, але чамусьці камгас тармозіць усю гэту справу. Няўжо яго зусім ня цікавіць, што 350 рабочым няма дзе зьбірацца і што заводзкія арганізацыі стаяць перад фактам поўнага зрыву культурна-масавай работы.

Трэба спадзявацца, што можа праз пралетарскі друк уласца зламаць упартасьць камгасу, і рабочыя заводу «Пралетары» будуць хоць у 1930 годзе мець свой невялічкі клюб.

Данілевіч.

Ліст у рэдакцыю

У № 284 «Зьвязды» зьмешчана заметка т. Олікера наконт арганізаванага сэкцыяй навуковых працаўнікоў вечару самакрытыкі на мэдфаку. Тав. Олікер высоўвае ў гэтай заметцы па адрасе цэнтральнага бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў абвінавачаньне ў тым, што яно, «замест сьмелага разгортваньня самакрытыкі па асноўных пытаньнях культурнага будаўніцтва, знаходзіць магчымым скарыстаць самакрытыку для вырашэньня асабістых спрэчак паміж асобнымі навуковымі працаўнікамі».

Лічу неабходным указаць, што аўтар заметкі, відавочна, упяршыню сутыкнуўся з дзейнасьцю сэкцыі навуковых працаўнікоў у галіне разгортваньня самакрытыкі. Інакш ён-бы ведаў, што сэкцыя навук. прац. ужо даўно мабілізавала сілы навуковых працаўнікоў вакол такіх цэнтральных пытаньняў, як барацьба за марксыцка - ленінскую мэтадалёгію навуковай працы, як праблема маладых кадраў, як рацыяналізацыя навуковага жыцьця і г. д. Даволі назваць пленум сэкцыі, які нядаўна адбыўся, дзе бурна разгарнулася самакрытыка, які зьвярнуў на сябе ўвагу ня толькі масы навуковых працаўнікоў, але таксама друку і шырокіх колаў нашай савецкай грамадзкасьці, і іншы мерапрыемствы сэкцыі, дзе самакрытыка накіроўвалася па рэчышчы асноўных і прынцыповых момантаў.

Але, побач з гэтым, а не замест гэтага, як мысьліць т. Олікер, Ц.В. знайшло неабходным аддаць некаторую ўвагу і выяўленьню тых бытавых умоў, якія парыдычна выклікаюць на мэдфаку канфлікты як паміж асобнымі працаўнікамі, так і паміж цэлымі групамі працаўнікоў. Ц.Б. не знайшло лепшага шляху да выяўленьня гэтых умоў, як самакрытыку саміх-жа працаўнікоў мэдфаку.

Калі ў ВНУ ёсьць нейкія ўмовы, што правакуюць пэрыдычныя канфлікты паміж работнікамі, дык гэта зусім не «драбніцы», а важнае грамадзкае пытаньне. Асабліва калі гэтыя «драбніцы» такога парадку, што яны часамі выбіваюць работнікаў з каляны на цэлым месяцы і дэзарганізуюць іх працаздольнасьць.

Нельга-ж у пытаньнях «высокай прынцыповасьці» разбаўляць канкрэтнае зло.

Старшыня ЦВ сэкцыі навуковых працаўнікоў С. ВАЛЬФСОН.

Яшчэ аб несваячасовым рэагаваньні на заметкі

Цэлы рад скаргаў рэдакцыя атрымлівае ад рабселькораў, што ўстановы рэагуюць на іх заметкі несваячасова, абмяжоўваюцца бюракратычнымі адпіскамі. Мы маем цэлы рад фактаў, калі на заметкі не адказваюць год і больш. Напамінкі таксама не дапамагаюць.

Падамо некалькі прыкладаў аб несваячасовым рэагаваньні і аб цяганіне з расьсьледваньнем.

За пэрыяд з 1-га студзеня на 10 лістапада рэдакцыя не атрымала адказу ад розных устаноў на 320 заметак, ад органаў РСІ—на 384. Праўда, за апошні час, пасьля цэлага раду напамінкаў, рэдакцыя пачала атрымліваць адказы. Але справа ня ў гэтым, што пасьля напамінкаў атрымліваюцца адказы, а справа ў тым, што рабіла тая ці іншая ўстанова, калі па некалькі месяцаў, а то і году, марынавала рабселькораўскія заметкі. У некаторых установах зусім пагінулі рабселькораўскія заметкі, і яны пішуць: «ніякіх матар'ялаў не атрымлівалі».

Вось некалькі прыкладаў цяганіны:

У красавіку месяцы рэдакцыя паслала на расьсьледваньне заметку «лавеце рыбу ў мутнай вадзе» ў Аршанскую РСІ. Матар'ял быў пераданы сьледчым органам. На працягу шасьці месяцаў цягнецца сьледзтва, абвешчана калегіяй РСІ вымова сьледчым органам і прапанавана ў двухтыднёвы тэрмін закончыць. Але... і да гэтага часу мы ня маем вынікаў.

Заметка «Чужы элемэнт у Акадэміі» пасылалася на расьсьледваньне. Нам паведамілі, што матар'ял накіраваны ў Наркамасьветы на вырашэньне. Бюро расьсьледваньня паслала напамінак, званіла некалькі раз па тэлефону, абяцалі «пашукаць» і «адказаць». А потым на нашым напамінку напісалі: памянёнага № у НКА на лічыцца» рэгістратар (подпіс неразборлівы). Так, загінуў матар'ял важнага характару ў наркамасьветаўскіх нэтрах.

Заметка «Трэба прызваць Гурскага да парадку» з студзеня паслана на расьсьледваньне райміліцыі Барысаўскага раёну, справа была перадана нарсьледчаму 10 вучастку. 25 студзеня бюро расьсьледваньня запыталася аб выніках. Быў зноў пасланы напамінак і толькі 31 кастрычніка сьледчы 10 вучастку патурбаваўся даць адказ. Дасьць месяцаў рэдакцыя ня ведала аб выніках расьсьледваньня.

Роўна праз год Магілеўская РСІ адказала на заметку аб растратчыку Комараву. Заметка пацьвердзілася, Комар прыгавораны быў да двух год пазбаўленьня волі і выключаны з радоў партыі. Магчыма, што Комар ужо адбыў сваё пакаранье пакуль Магілеўская РСІ сабралася даць адказ.

Вось яшчэ некалькі фактаў адпіскі. У сакавіку месяцы рэдакцыя накіравала заметку «Такім элемэнтам няма месца» Мазырскай акрстрахкасе для прыняцьця мер. Чакалі адказу кала 7 месяцаў. Маўчаць... Урэшце напомнілі. Але атрымалі вось што: «заметкі ў справах акрстраху няма»... Бюро расьсьледваньня вымушана было яшчэ раз напомніць і растлумачыць, аб чым ішла ў заметцы справа.

І што-ж, хаця ня поўны, але адказ атрымалі. Акрстрахкаса піша, што тав. Грыбаў, аб якім ішла гутарка ў заметцы, зараз не працуе, ён зьняты з працы. А за што — нам невядома. Ня лепш стаіць справа і ў Галоўсацстраху. На адну заметку прышлося чакаць адказу каля пяці месяцаў. Калі быў пасланы напамінак, то супрацоўніца Галоўсацстраху звоніць: «таварышы, у нас вашага матар'ялу ня значыцца». І калі прышлося яе пераканаць, што па разноснай кніжцы матар'ял Галоўсацстрахам атрыманы, яна супакоілася. Але ўсё-ж да гэтага часу мы не атрымалі адказу.

Невядома таксама, чым скончылася справа батрачкі Абакун Параскі. Яшчэ ў студзені месяцы бюро расьсьледваньня ўзьняло пытаньне перад адпаведнымі органамі аб пераглядзе яе справы. Менакрсуд паведаміў, што справа Абакун накіравана пракурору. Менскай акругі для апрацэтаваньня. У які бок вырашылася справа, а мо' і не — нам невядома. Але гэта гаворыць, што судова-сьледчыя органы марудзяць з выкананьнем розных спраў.

Трэба падкрэсьліць, што ўсе ўстановы забыліся аб пастанове НК РСІ. Магчыма, што НК РСІ яшчэ раз напомніць аб своячасовым рэагаваньні на заметкі, якія пасылаюцца на расьсьледваньне і якія друкуюцца ў газэтах.

Іп. Б.

Субота 21 сьнежня. **Клюб імя Карла Маркса** Панядзелак 23 сьнежня.

Толькі два канцэрты вядомага дзяржаўнага

ВАКАЛЬНАГА КВАРТЭТУ імя ЛЫСЕНКА (Украіна).

У складзе А. Шэпэткоўскага (тэнор), І. О. Трацьцяка (тэнор), М. Р. Беспалава (барытон), В. Дзехцярова (бас).

У ПРАГРАМЕ: украінскія рэвалюцыйныя, народныя і бытавыя сьпевы, казацкія думы, сьпевы народаў СССР на расійскай, беларускай, яўрайскай, татарскай, грузінскай і інш. мовах, а таксама творы эўрапейскіх кампазытараў.

Пачатак а 8 гадз. 30 мін. увечары.

Білеты ў рабочай касе штодзенна ад 12 да 2 гадз. і ад 4 да 6 гадз. увечары, а ў дзень канцэрту ў касе клюбу.

ДНЕПРОВСКОЕ ГОСУДАРСТВЕННОЕ РЕЧНОЕ ПАРОХОДСТВО

с целью выявления потребного рабочего ядра флота, необходимого для обеспечения перевозок массовых грузов

В НАВИГАЦИЮ 1930 ГОДА,

просит все учреждения и организации, пользующиеся транспортными услугами Днепровского Госпароходства,

СООБЩИТЬ СВОИ ОРИЕНТИРОВОЧНЫЕ ЗАЯВКИ

на перевозки грузов большой и малой скорости с указанием пристаней отправления и назначения, рода перевозки и количества грузов по каждой пристани не позже 1-го января 1930 г., а окончательные рабочие планы перевозок не позднее 15 января 1930 г. с тем, чтобы и 1 февраля 1930 г. были заключены договора на эти перевозки.

При незаключении договоров к указанному сроку Днепровское Госпароходство не может гарантировать своевременного выполнения перевозок, так как в первую очередь будет выполнять перевозки, обеспеченные договорами, а все прочие—на общем основании в порядке очереди, в зависимости от наличия свободного тоннажа.

Заявки просьба направлять по адресу: г. КИЕВ, ул. РЕВОЛЮЦИИ № 36, Эксплоатационно-Коммерческому Отделу Днепровского Госпароходства.

Телеграфный адрес: КИЕВ-РЕКА. ПРАВЛЕНИЕ.

ОТКРЫТА ПОДПИСКА на 1930 г.

на новый производственный, общественный и научно-популярный массовый журнал, посвященный вопросам организации питания

Общественное питание

Выходит регулярно 2 раза в месяц, начиная с 1 января 1930 года. Журнал реорганизован из ежемесячного журнала „НАРПИТ" и рассчитан на кооперативный актив, столовые комиссии, потребителей и широкие круги работников столовых, фабрик-кухонь и буфетов.

„Общественное питание" будет печатать в каждом номере статьи руководителей общественного питания, крупнейших представителей научного мира, практиков-кулинаров и практических работников мест. Журнал будет служить организующим центром работы столовых комиссий и всей общественности столовых и фабрик-кухонь. Вопросы культурного обслуживания столующихся, методы массовой работы—все это найдет свое отражение в новом журнале. В статьях инженеров и техников—строителей—журнал будет давать подробный разбор последних сооружений по общественному питанию, обсуждать принципы строительства новых фабрик питания. Журнал будет печатать подробную хронику технических достижений внутри СССР и заграницей.

„Общественное питание" будет знакомить со всеми новостями кулинарии. Читатель найдет в журнале рецепты новых блюд, переводы из лучших заграничных кулинарных журналов, получит ответы на вопросы, как улучшить и упростить питание, о роли и способах приготовления овощей и т. д.

„Общественное питание" в отделе физиологии питания (редактор проф. **М. Н. Шатерников**) даст понятие о физиологии питания человека в связи с общими функциями организма человека. Особый отдел будет посвящен санитарии и гигиене питания (редактор проф. **А. Б. Мольков**). В нем читатель найдет статьи о санитарно-гигиеническом режиме и о правилах для посетителей столовых и для персонала.

„Общественное питание", кроме того, будет регулярно давать ряд отделов, рассчитанных на широкое участие рабкоров с мест. Особый „Уголок потребителя" рассчитан на участие в журнале самих потребителей. Задача отдела—содействие устранению недочетов.

В каждом номере: новости науки и техники. беседа с читателями (краткие ответы на вопросы читателей по различным отраслям техники, кулинарии, работе столовой сети), литературный очерк, по Москве, справочник (выдержки из важнейших постановлений по общественному питанию), 20 фото и зарисовок, об'явления.

В ЖУРНАЛЕ ПРИНИМАЮТ УЧАСТИЕ:

Б. Альтман, А. Ю. Альшванг, Н. Н. Алексеева, С. А. Белоголова, д-р Э. М. Бархэн, Л. Басин, Бор, Волгин, арх. Волинковский, д-р Б. В Виленкин, Вологдина (Нижн.-Новгород), **Д. Л. Гинцберг, проф. Ган, Гессен** (Госплан СССР), **д-р М. М. Гринберг, П. Н. Данилкин, д-р Егоров** (Ленинград) **И. Д. Защипин, проф. Игнатов, Комаров. КОКШАРОВА** (ЦК Наркпит), **инж. Краснощеков, Кощавка** (Киев), **Курбатов** Ленинград, **проф. Лаворов, О. П. Молчанова. С. Н. Мацко, инж. Михалев, проф. А. Б. Мольков, Е. Микутина, Мамаева** (Транспосекция), **пр.-доц. Н. Н. Мюллер, В. А. МОЙРОВА, д-р Маршак, К. Я. Озоль, проф. З. И. Поезжнер; д-р Л. Г. Политов, д-р Д. И. Ромашов. Ранит.на** (отд. работниц ЦК ВКП(б), **Н. Н. Столкинд, С. Спектор** Вологда), **проф. СЫСИН, Н. А. СЕМАШКО, М. Сейфи, Тимонин** (ЦК Наркпит), **д-р Терешкович, д-р Федоров, Фольц, Холодова, д-р А. А. Хрусталев, АРТ. ХАЛАТОВ, Черняевский** (ВЦСПС) **инж. Шустров, проф. М. Н. ШАХТЕРНИКОВ, проф. П. П. Эмиэт, Яковлева, Н. С. Ярусова** и мн. друг.

Художник—**Захаров.** Фото **Сирябин, В. Соловьев, Рикк. Прехнер.**

Отв. редактор **И. Н. Алексеева.**

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ: на год (24 номера журнала) —6 руб., на 6 месяцев—3 руб. 50 коп., на 3 мес.—2 руб.

Цена отдельного номера—35 коп.

Годовые подписчики получают скидку в 10 проц. на все издания „НАРПИТА" и „КООПЕРАТИВНОЙ ЖИЗНИ", в частности со скидкой Годовые подписчики, внесшие до 1 января 1930 года подписную плату полностью, получат БЕСПЛАТНО новую книгу: прив.-доц. Н. К. Мюллер и С. Белоголов „Кушайте овощи". Содержание: Что каждому нужно знать об овощах. Какие овощи употреблять в пищу. Правила обработки овощей. Рецепты изготовления бульонов из овощей, супов, борщей, окрошек, тушеная свекла в сметане, фаршированные помидоры и огурцы, рагу из овощей. Салаты, Фруктовые блюда и т. д.

ЗАКАЗЫ НАПРАВЛЯТЬ: издательству „Кооперативная Жизнь": Москва, Ильинка, Рыбный пер., 3., уполномоченным „Кооперативной Жизни" при кооперат. организациям, а также изд-ву „Нарпит", Москва.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакуманты лічыць несапраўднымі:

Вайск. кн. Клімовіча І. Е., выд. мен. васнкаматам 325
Пашпарт Шэхтман К. Л., выд. мен. міліцыяй 326
Пасьведч. Байкоўскай Б. В., выд. Макаўчыцк. с/с. Койд р-ну 327
Чл. біл. саюзу саўгандальслужачых Мінуўскага А. Г. 328
Пасьведч. на права нашэньня зброі. выд. Мазырск. АДПУ на імя Строгіна Х. 329
Даведка аб працы Трэпянюк Е. П., выд. саўгасам «Тарасава» 330
Наборн. кн. Вансовіча С. П., выд. ТПО МБВ чыг. 331
Пашпарт Каган Т. І., выд. мен. міліцыяй 332
Чл. кв. саюзу будаўнікоў № 6-35125 Каленіка А. Ф. 333
Асабов. пасьведч. Каленіка А. Ф., выд. вяч. раб. унівэрсытэтам 334
Шлюбн. пасьведч. Чыжэўскага У., выд. Сноўскім ЗАГСам 335
Асабов. кн. Ахрамовіча І. А., выд. Сьмілавіцк. РВК 336
Вуч.-конск. кн. Ахрамовіча І. А., выд. Сьмілавіцк. РВК 337
Пашпарт Ротшыльда Я. С., выд. мен. міліцыяй 338
Вуч.-конск. кн. Давідовіча У. С., выд. Астр.-Гарадзецк. РВК 339
Чл. біл. саюзу будаўнікоў № 6-40625, даведка аб працы, выд. заводам № 3 Гандальбуду на імя Багдановіча П. 340
Вуч. конск. карт. Александровіча П. П., выд. Астр.-Гарадзецк. вэт. пунктам 341
Асабов. вайск. кн. Сініцкага Ф. П., выд. Пухавіцкім РВК 342

14-XII Прыблудзілася КАРОВА

Зварочвацца Грыгораўская, 1, кв. 1

ПРАПАЎ САБАКА

«ПОНТЭР», РАБЫ з кафейнымі плямамі, 10-ці месяцаў. За ўтайку буду праследваць па закону. Прашу паведамць па адрасе: пасаж., на квал, кавённы будынак, д. № 21 кв. 1, С. П. Адынец, або паведаміць па тэлефону пасаж. вакзал № 43.

ПРЫБЛУДЗІЎСЯ САБАКА

КАБЕЛЬ, шэрсьць пёмная-шэрая

Паведамленьні

СЁНЬНЯ

— А 7 гадз. увечары, у памяшк. АК МОПР (Савецкая 87), склікаецца пасяджэньне сэкцыі АК па шэфству над палітьвязьнямі. Павінны зьявіцца т. т. Каган (скарняжная ф-ка), Баброўнікава (ЖАКТ 1) Каплан (харчавікі), Бернацкі (унів. гарадок), Памарэнец—ЦП Будаўнікоў, Шыманскі—«Дрэваапрацоўшчык», Кірэнэр — «Бальшавік», Саламонаў—т-ва п-катаржан.

Шэфсэкцыя.

Пэдгабінэт. Пленум акруговай мэтадычнай камісіі ў 19 гадзін. Гурткі па плянаваньні і лічэньні для дашкольных і па грамаце для нулявых груп у 20 гадзін.

Рэсп. Бюро АРУ. Аб'ядн. пасядж. прэзыд. рэсп. бюро АРУ і інст. дзярж. бухгальтароў-экспэртаў—у 18 гадз. (Савецкая, 55, пак. 3). Запрашаюцца ўсе галоўн. і старэйш. бухгальт. і актыў АРУ.

Клюб «ДЭДПРАЦАЎНІК»

19 сьнежня а 6-й гадзіне ўвечары, у клюб «Медпрацаўнік», (Рэвалюцыйная, 2)

пачынаецца чыстка апарату ЦП саюзу Мэдсанпрацы

Просьба да ўсіх сяброў саюзу прыняць актыўны ўдзел у чыстцы. Таксама просьба да таварышоў, якія маюць матар'ялы, падаваць старшыні камісіі тав. **Гарадзецкай** (ЦП саюзу МСП).

КАМІСІЯ

ЗАЎТРА

Пэдгабінэт. Сход сэкцыі інтэрпацыянальнага выхаваньня — у 19 гадзін (даклады — 14 і 23-й школ), канфэрэнцыя наст. нулявых груп — у 19 гадзін.

Клюб навуковых працаўнікоў. 20-га сьнежня працяг вечару самакр. па мэдфаку. Пач. а 20 гадз.

Пушкінская бібліятэка. Самаперападрыхтоўка бібліятэчных работнікаў адбываецца 10, 20 і 30 кожнага месяца — у 9—10½ гадз. Для хатнікаў прыгарадных хат-чыт., перасовачнікаў і кніганошаў арганізоўваецца спэцыяльны сэмінары, які працуе 15 і 30 кожнага месяца.

У чацьвер 19-XII, а 6 г. увечары ў памяшк. АК МОПР'у (Савецкая 87), адбудзецца пасяджэньне інструктарскай сэкцыі пры АК, на якім будуць разгледжаны вывады абсьледваньняў мопр-ячэек: Эльводу, Наркамфіну, і зав. «Камунар». Выклікаюцца т. т.: Канстанцінаў, Файнштэйн, Ліпманава, Шкляр, Рубінраўт, Румаиоў, Левітан (1 Дзяржрукарня), Нядзьвецкі, Шмэрліг, Баранаў, Оташэўская, Норкіна, Гурэвіч, Левітан С. і Мышкоўская, а таксама сакратары ячэек МОПР'у вышэй паказаных прадпрыемстваў. Яўка абавязкова.